Чырвоная змена

ТАБЕ, АБІТУРЫЕНТ!

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ ТЫХ, ХТО ЗБІРАЕЦЦА ПАСТУПАЦЬ

«Прамая лінія»

ЖЫЦЦЁ З АЛЕРГІЯЙ

Гэта паталогія даволі частая і сустракаецца ў кожнага пятага жыхара зямлі. Алергія — гэта не толькі цяжкія захворванні, напрыклад, бранхіяльная астма, але і рыніт, крапіўніца, іншыя хваробы. Вельмі шмат алергенаў знаходзіцца ў памяшканнях, дзе мы жывём. Як вынік — бытавыя алергены ўздзейнічаюць на чалавека круглы год.

Людзям, схільным да алергічных рэакцый рознага паходжання, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў у штодзённым жыцці. Якіх? Пра гэта мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой прыме ўдзел кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла Вячаслававўна Маслава. Прамая лінія адбудзецца **сёння з 13.00 да 14.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**.

WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 САКАВІКА 2011 г. СЕРАДА № 53 (26917)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

НОВАЯ АГРАРНАЯ ПРАГРАМА: ГАСПАДАРСКІ ПАДЫХОД

УЧОРА Прэзідэнт Беларусі заслухаў справаздачу Урада аб развіцці вёскі, падчас якой была прадстаўлена новая, чацвёртая па ліку, аграрная праграма — Дзяржаўная праграма развіцця сельскіх тэрыторый на 2011-2015 гады. Выкананне папярэдніх дазволіла Беларусі не толькі пераадолець сур'ёзнае падзенне галіны ў постперабудовачныя гады, але і дабіцца яе дынамічнага росту.

За апошнюю пяцігодку словы «адраджэнне і развіццё» набылі для вёскі цалкам канкрэтныя і акрэсленыя рысы: створана сетка з 1481 аграгарадка, дзе пабудавана 8016 жылых дамоў, рэканструявана і пабудавана 1477 малочнатаварных фермаў, 213 комплексаў па вырошчванні і адкорме свіней і буйной рагатай жывёлы, 60 птушкафабрык. Плошча сельгасугоддзяў у сярэднім на гаспадарку павялічылася ў 1,4 раза. У 2010 годзе, паводле ацэнак Белстата, вытворчасць валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі на аднаго працаўніка склала 56 млн рублёў пры заданні 30-35 мільёнаў. Прадукцыйнасць працы ў параўнанні з 2005 годам павялічылася ў 1,8 раза. Аб'ём аграрнага экспарту склаў 3,3 млрд доларaў ЗША супраць 1,3 млрд у 2005 годзе... Разам з тым застаецца і шэраг праблем: велізарная запазычанасць сельгасарганізацый, нізкая рэнтабельнасць продажу прадукцыі, адставанне ад прагнозных паказчыкаў па тэмпах росту вытворчасці і пашырэння асартыменту прадукцыі.

Адно з асноўных дасягненняў рэалізацыі папярэдніх аграрных Дзяржпраграм, якое вылучыў кіраўнік дзяржавы — забеспячэнне харчовай бяспекі краіны, што стала трывалай асновай для сацыяльна-палітычнай стабільнасці нашага грамадства. Сельгаспрадукцыя ўсё чацвёртае, мясной групы — на пятае-шостае.

Паводле разлікаў экспертаў, плацежаздольны попыт на прадукты харчавання ў свеце за бліжэйшыя пяць гадоў вырасце ў 1,3-1,4 раза. Беларускім вытворцам у барацьбе за знешнія рынкі давядзецца канкурыраваць з глабальнымі транснацыянальнымі кампаніямі. Для забеспячэння стабільнасці экспартных паставак неабходны магутны міжнародны маркетынг, буйныя айчынныя ці сумесныя кампаніі, здольныя весці агрэсіўную палітыку продажу. Іх трэба будзе стварыць.

Паводле слоў прэм'ер-міністра, незалежна ад таго, замежныя, сумесныя ці нацыянальныя кампаніі будуць дамініраваць на беларускім рынку, прыярытэт трэба аддаваць вяскоўцу. Гэта значыць, дадатную вартасць па сродках цанавой інвестыцыйнай палітыкі акумуляваць у асноўным у сыравінных звёнах тэхналагічнага ланцужка.

У адпаведнасці з праектам праграмы, 70 працэнтаў усяго сельскагаспадарчага экспарту ў бліжэйшыя пяць гадоў забяспечыць мяса-малочная група тавараў. Ставіцца беспрэцэдэнтная задача: за пяць гадоў пабудаваць 875 і рэканструяваць больш як 1350 малочнатаварных фермаў, што разам з прыростам прадукцыйнасці і пагалоўя кароў дазволіць выйсці на вытворчасць як мінімум 10,5 млн тон малака за год.

Экспарт мяса і мясапрадукцыі мяркуецца павялічыць за пяцігодку ў 2,8 раза. З улікам актыўнага развіцця вытворчасці мяса свініны і птушкі (так званага «хуткага мяса») у Расіі, урад удакладніць знешнеэканамічную стратэгію. Канкурэнцыя ў сегменце ялавічыны і прадуктаў з яе на працягу бліжэйшых трох гадоў будзе менш інтэнсіўнай, і гэтым трэба скарыстацца.

Трэці складнік росту экспарту — прадукцыя раслінаводства. У мінулай пяцігодцы гэтыя пытанні не ўдалося вырашыць у поўным аб'ёме. Летась, напрыклад, у краіну завезена па імпарце садавіны і гародніны, прадуктаў іх перапрацоўкі на 408 млн доларaў. Экспарт бульбы — нацыянальнага беларускага брэнда — плануецца павялічыць за пяцігодку ў 10 разоў. Ужо ў 2011 годзе будзе забяспечана ўнутраная патрэба краіны ў крупах, у тым ліку ў грэчцы. У 2015 годзе чакаецца вытворчасць збожжа ў аб'ёме 12 млн тон, цукровых буракоў — 5,5 млн, ільну — 60 тыс, масла з насення рапсу — 1,06 млн, бульбы — 7,75 млн і іншай гародніны — 2,16 млн тон. Сярэднямесячная заработная плата ў сельскай гаспадарцы ў 2015 годзе павінна скласці ў эквіваленце 750 доларaў ЗША.

Увогуле новая аграрная праграма з'яўляецца комплекснай і ўключае ў сябе 18 праграм рознага ўзроўню. На яе рэалізацыю ўрад запрасіў 244 трлн рублёў, у тым ліку на развіццё вытворчай сферы — 232 трлн.

Аляксандр Лукашэнка падвергнуў жорсткай крытыцы структуру Праграмы. У яе нейкім чынам уключылі падпраграмы, даўно зацверджаныя кіраўніком дзяржавы, Саветам Міністраў, міністэрствамі і ведамствамі. Яны ўжо рэалізуюцца, і пытанняў па іх фінансаванні няма. Недарэчнымі, на думку кіраўніка дзяржавы, выглядаюць у структуры выдаткаў на фінансаванне Дзяржпраграмы і сродкі на бягучую дзейнасць сельскай гаспадаркі. Падыход Прэзідэнта даволі канкрэтны: аграпраграма павінна ўключаць толькі тое, што дзяржава зробіць для галіны. А гэта тое, з чым самастойна гаспадаркі і аблвыканкамы не справяцца: будаўніцтва фермаў, меліярацыя земляў, іх урадлівасць... Усё астатняе павінна вырашацца і рабіцца на месцах. Пры такім раскладзе кошт праграмы змяншаецца амаль удвая. Аднак і гэта не мяжа. Патрэбы абласцей у колькасці новых малочнатаварных фермаў, іншых вытворчых будынкаў, а разам з імі і фінансаванне, былі, па-ранейшаму, завышаныя. Аляксандр Лукашэнка не пагадзіўся і з лічбай фінансавання, якое павінна было пайсці на будаўніцтва памяшканняў для захоўвання бульбы.

— На захоўванне бульбы яшчэ трыльёны рублёў будзем выдаткоўваць? У нас столькі пустуе памяшканняў, абсталюйце іх! Па-гаспадарску трэба падыходзіць!

Гаспадарскі падыход — галоўнае патрабаванне кіраўніка дзяржавы і да ўсіх астатніх пунктаў праграмы. У тым ліку і грошай. Крэдытныя сродкі банкаў, бюджэтныя сродкі, выдаткаваныя гаспадаркам, не павінны спісвацца і ў абавязковым парадку іх неабходна вярнуць. Таму, перш чым узяць, кіраўнікам трэба думаць, як яны іх збіраюцца вяртаць.

— Каб не было, што адзін працуе, другі крэдытаў чакае... Напрэгчы трэба ўсіх!

Такое ж жорсткае стаўленне і да закупак абсталявання за валюту. Там, дзе без гэтага немагчыма абысціся, пытанне павінна вырашацца аператыўна. У якасці прыкладу кіраўнік дзяржавы прывёў пастаўкі лекаў. А калі тыя ж угнаенні, крыху паварушыўшыся, рэальна і, дарэчы, больш танна набыць у Беларусі, то да гэтага і трэба імкнуцца. Прэзідэнт адзначыў, што сёння ў свеце сітуацыя даволі складаная, і кожная дзяржава імкнецца стварыць для сябе пэўную «падушку бяспекі» ў выглядзе золатавалютных рэзерваў.

Вялікую ўвагу падчас нарады Аляксандр Лукашэнка надаў фарміраванню кадравага корпусу, здольнага вырашаць аграрныя праблемы на сучасным узроўні. На яго думку, наспела неабходнасць рэвалюцыі ў сельскагаспадарчых ВНУ. На шмат больш значную ўвагу трэба надаць практыцы, якую лепшыя з лепшых павінны праходзіць у гаспадарках-флагманах і потым перанесці гэты вопыт на месца сваёй будучай працы.

Падводзячы вынікі нарады, кіраўнік дзяржавы адзначыў негатоўнасць урада да абмеркавання тэмы развіцця сельскай гаспадаркі. Аляксандр Лукашэнка раскрытыкаваў бюракратызм распрацоўшчыкаў праекта Дзяржпраграмы, які выліўся ў тысячы паперак, і запатрабаваў ліквідаваць усялякі дубляж. Да чацвёртай па ліку аграпраграмы пасля яе дапрацоўкі вернуцца пазней, у больш вузкім складзе. Аднак згодна з патрабаваннем Прэзідэнта, сярод удзельнікаў наступнай нарады абавязкова павінны прысутнічаць практыкі — кіраўнікі лепшых гаспадарак.

Сяргей ПРОТАС.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПЛАНУЕ ЗНАХОДЗІЦЦА 26 КРАСАВІКА Ў ПАЦЯРПЕЛЫХ АД АВАРЫІ НА ЧАЭС РЭГІЁНАХ, А НАПЯРЭДАДНІ НАВЕДАЦЬ ЧАРНОБЫЛЬСКІЯ МЕРАПРЫЕМСТВЫ Ў КІЕВЕ

ПРЭЗІДЭНТ Беларусі Аляксандр Лукашэнка плануе знаходзіцца 26 красавіка, па традыцыі, у пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы рэгіёнах краіны, а да гэтага прыняць удзел у чарнобыльскіх мерапрыемствах, якія пройдуць у Кіеве. Аб гэтым паведаміў журналістам кіраўнік прэс-службы кіраўніка дзяржавы Павел Лёгкі.

«З 1994 года Аляксандр Лукашэнка штогод 26 красавіка працуе ў рэгіёнах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Гэтыя паездкі сталі трывалай традыцыяй, гэта вельмі важна, і людзі, напэўна, не зразумеюць, калі іх Прэзідэнт у сумны дзень чарнобыльскай катастрофы будзе не з імі», — адзначыў Павел Лёгкі, каменціруючы паведамленні шэрагу ўкраінскіх СМІ аб тым, што Аляксандр Лукашэнка не будзе ўдзельнічаць у міжнароднай канферэнцыі ў сувязі з 25-гадовай гадавінай на ЧАЭС, а наведае Кіеў толькі 26 красавіка.

«У нас няма падстаў сцвярджаць іншае, таму што аб кіеўскай сустрэчы прэзідэнтаў (Украіны, Беларусі і Расіі. — **Заўвага БЕЛТА**) нам нічога не вядома», — сказаў кіраўнік прэс-службы кіраўніка дзяржавы.

Адзначаючы важнасць наведвання 26 красавіка Прэзідэнтам Беларусі пацярпелых рэгіёнаў краіны, Павел Лёгкі заявіў, што Аляксандр Лукашэнка ў гэты дзень «сустракаецца з людзьмі, асабіста кантралюе, як рэалізуюцца праекты па адраджэнні гэтых зямель і забеспячэнні тут бяспечнага і паўнацэннага жыцця людзей».

ХУТКІ «ФЛІРТ»!

Трохгадовы мінчанін Мікалай Завадскі *(на фотаздымку ўнізе)* стаў адным з першых пасажыраў швейцарскага цягніка вядомай фірмы «Stadler». Вольга Аляксандраўна Лобань — колішняя чыгуначніца, прывяла ўнука на прэзентацыю цягніка «Флірт», якая адбылася ўчора на цэнтральным чыгуначным вакзале сталіцы. Хто ведае, магчыма, хлопчык калі-небудзь таксама звяжа свой лёс з чыгункай і абярэ прафесію кіраваць электрацягнікамі. А пакуль ён будзе ездзіць на каленях бабулі на дачу і назіраць, як мільгаюць за акном дамы, дрэвы і палеткі. Бо цягнік можа развіваць хуткасць да 140 кіламетраў у гадзіну, а магчыма, і ўсе сто шэсцьдзясят. Хлопчыку пакуль неабавязкова ведаць, што даўжыня электрацягніка 75 з хвосцікам метраў, што ён складаецца з 4 вагонаў і ў ім 260 месцаў для сядзення. Але якіх! І што ехаць могуць адразу 624 пасажыры. Утульна і камфортна будзе і дарослым, і дзецям. Для інвалідаў і мам з каляскамі ёсць спецыяльныя месцы, зручна стане веласіпеды і буйнагабарытны багаж. Кандыцыянеры і маніторы для прагляду відэа, рэкламы ці слайдаў — рэчы, без якіх цяжка ўявіць сённяшняе жыццё, не тое што будучыню.

Першыя штадлераўскія цягнікі выклікаюць у нас непадробную цікавасць, але пройдзе год з невялікім і стане нормай ездзіць з канца ў канец сталіцы не на аўтобусе і трамваі, а на цягніку, які адпавядае сусветным стандартам, хутка і камфортна дабірацца да гарадоў-спадарожнікаў і больш аддаленых чыгуначных гарадоў. Чыгуначнікі абяцаюць тэрмінова выканаць усе неабходныя тэхнічныя работы і правесці рэканструкцыю інфраструктуры, каб у канцы трэцяга квартала 2011 года пачаўся рэгулярны рух на спецыяльным сталічным маршруце «Гарадскія лініі». На прэзентацыі новага электрацягніка (з традыцыйным пераразаннем чырвонай стужкі і зрываннем белага покрыва) кіраўнік Беларускай чыгункі Анатоль Сівак паведаміў, што днямі заключаны маштабны кантракт на пастаўку ў краіну цягам гэтага года 10 адзінак цягніковага сямейства «Флірт», а прэзідэнт фірмы «Stadler» Петэр Шпулер спадзяецца, што беларусы па-вартасцях ацэняць славутую швейцарскую якасць.

Пакуль маленькі хлопчык Міколка здзяйсняў з бабуляю экскурсію па цягніку «Флірт», на пероне грымеў славуты марш «Развітанне славянкі» ў выкананні духавога аркестра МНС і нешта пяшчотнае выводзілі маладыя швейцарцы на традыцыйных горных дудах, падобных на нашу сурму.

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

«Прамая лінія»

НА СУВЯЗІ — МІНІСТР

Пенсіі, працаўладкаванне, варыянты сацыяльнай падтрымкі — усё гэта стане тэмай «прамой лініі», якую правядзе міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна Акіндзінаўна ШЧОТКІНА.

Як паведаміла прэс-сакратар міністэрства Варвара Аляксандровіч, «прамая лінія» пройдзе **24 сакавіка з 11.00 да 12.30**. У гэты дзень і час задаць свае пытанні міністру можна двума шляхамі — па тэлефоне **(017) 306-37-95** або праз сайт **www.mintrud.gov.by** (раздзел «Інтэрактыўныя канферэнцыі»). Прычым пры другім варыянце ўсе адказы будуць змешчаны на гэтым жа сайце.

АБ УВЯДЗЕННІ «ЛЕТНЯГА» ЧАСУ

Паведамляем, што 27 сакавіка 2011 г. у адпаведнасці з парадкам вылічэння часу, вызначаным пастановай Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 13 мая 1996 г. № 317, на тэрыторыі рэспублікі будзе ажыццёўлены пераход на «летні» час. У сувязі з гэтым 27 сакавіка 2011 г. у 2 гадзіны стрэлкі гадзіннікаў пераводзяцца на адну гадзіну наперад.

В.Н. КАРАШКОЎ, старшыня Дзяржстандарта, Старшыня Міжгаліновай камісіі часу, частаты і вызначэння параметраў вярчэння Зямлі.

ЗЛАМЫСНІК «НАСЛЯДЗІЎ»

Мужчына, які ўкраў у краме бутэльку гарэлкі і ўцёк, згубіў на месцы ўчынення злачынства свой пропуск з фотаздымкам.

Па дакументе праваахоўнікі хутка вылічылі небараку, у дачыненні якога заведзена крымінальная справа. 31-гадовага слесара аднаго са сталічных прадпрыемстваў «падвяла» гарэлка: заліўшы за каўнер, ён накіраваўся за дабаўкай, але ўжо ў краме выявіў, што грошай на бутэльку не хапае. Схаваўшы бутэльку гарэлкі ў рукаў, мужчына накіраваўся да выхаду. Падазронага пакупніка ля выхаду паспрабавала спыніць для праверкі жанчына-ахоўнік магазіна. Мужчына ж, які зразумеў, што «спаліўся», кінуўся наўцёкі. Ужо праз некалькі хвілін ён у суседнім дварэ спатоліў «смагу» і пайшоў дадому, дзе яго «цёпленькім» і ўзялі супрацоўнікі міліцыі. Між іншым, пакараннем за учыненае злачынства можа стаць пазбаўленне волі тэрмінам да 6 гадоў.

Ігар ГРЫШЫН.

СЯЎБА «ПА ЧАРАПКУ»

Гэты вядомы агратэхнічны прыём пачалі на практыцы выкарыстоўваць земляробы поўдня Гомельшчыны. «Па чарапку» — значыць, па яшчэ падмёрзлай глебе. Трактары з травянымі сеялкамі працуюць у асноўным ранняй марознай раніцай па ледзяной скарынцы. Гэта дазволіць крыху знізіць напружанасць на будучай масавай сяўбе.

Гаспадаркі Гомельскай вобласці ўнеслі пад яравую сяўбу каля 35 тыс. тон калійных угнаенняў, што складае 40% да плана. Як расказалі ў прэс-службе камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гомельскага аблвыканкама, да правядзення веснавых палявых работ прыступіла большасць гаспадарак Гомельскай вобласці. Мяркуецца, што масавая сяўба пачнецца ў першай дэкадзе красавіка.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДАЦЭНТ-ХАБАРНІК?

Дацэнт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання падазраецца ў атрыманні хабару. Праваахоўныя органы атрымалі ад выпускніковай ВНУ інфармацыю, што гэты выкладчык сістэматычна атрымліваў ад студэнтаў грошы за станоўчае вырашэнне пытанняў па экзаменах, заліках, абароне курсавых работ. Сумы, паводле папярэдняй інфармацыі, даходзілі да 2-х тысяч доларaў з адной навучальнай групы за год. Расследуецца крымінальная справа.

Ул. кар.

Грошы

НАЦБАНК: БАНКІ МАЮЦЬ ДАСТАТКОВА ВАЛЮТЫ, КАБ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ЁЙ «АБМЕННІКІ»

ІНФАРМАЦЫЯ пра тое, што Нацыянальны банк не будзе прадаваць камерцыйным валюту для падтрымкі пунктаў абмену валюты, некалькі насцярожыла пэўную частку беларусаў. У прыватнасці, людзей турбуе наступнае: ці не прывядзе апошні захад галоўнага банка краіны да дэфіцыту наяўнай СКВ у «абменніках»? Каб праясніць сітуацыю, мы звярнуліся па каментарый непасрэдна ў Нацыянальны банк.

— У сувязі з тым, што ў нас змяніліся правілы куплі валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы (павялічыліся тэрміны рэзервавання сродкаў на куплю замежнай валюты з 1 да 30 дзён) і ў той жа час рэзка павысіўся попыт на наяўную валюту ў грамадзян, Нацыянальны банк, каб вырашыць гэтую праблему, сваім пісьмом ад 15 сакавіка дазволіў камерцыйным банкам купляць валюту для абменных пунктаў напрамую ў Нацыянальным банку, — тлумачыць **прэс-сакратар — начальнік упраўлення інфармацыі Нацбанка Анатоль ДРАЗДОЎ**. — Мы дапамагалі людзям. Дапамагалі тыдзень, а 22 сакавіка гэтае рашэнне проста адмянялі, лічачы, што далей банкі самі справяцца з забеспячэннем абменных пунктаў валютай. Гэта чыста тэхнічнае пытанне.

— Разам з тым, паводле некаторых звестак, камерцыйным банкам і самім нестае замежнай валюты?

— У адным толькі ААТ «ААБ Беларусбанк», паводле слоў старшыні праўлення банка Надзеі Ермаковай, на рахунках знаходзіцца 3 мільярды доларaў ЗША. Гэта называецца — у банкаў няма валюты? Калі «Беларусбанк» вырашыць усё гэта прадаць, беларусы і паловы не купяць.

— Анатоль Фёдаравіч, гэта значыць, банкі валодаюць неабходнымі сродкамі, каб цалкам забяспечыць абменныя пункты валютай?

— Зразумела. Нацыянальны банк таму так мякка і дзейнічаў пасля павелічэння тэрмінаў рэзервавання сродкаў на куплю замежнай валюты, каб даць магчымасць камерцыйным банкам адаптавацца. Мы ім дапамагалі, але ў рэшце рэшт у банках ёсць свой менеджмент, больш за тое, на рахунках банкаў застаецца 80 працэнтаў валюты, якая паступае ў краіну, Нацыянальны банк купляе толькі пятую частку.

— Такім чынам, зыходзячы з магчымасцяў банкаў, нам наўрад ці трэба чакаць дэфіцыту наяўнай валюты ў пунктах яе абмену?

— Так. У перыяд ажыятажнага попыту на замежную валюту магчымыя кароткатэрміновыя перабоі, але не больш за тое.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Выстава

БЕЛАРУСКІ БУДАЎНІЧЫ РЫНАК ПРАПАНУЕ. УСЁ САМАЕ ЛЕПШАЕ!

Элемент калектыўнай экспазіцыі з макетам санаторыя на Нарачы прыцягвае ўвагу наведнікаў.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

«ААТ «Гродзенскі шклозавод» па традыцыі прывёз новыя ўзоры шкла», — расказвае інжынер па маркетынгу Павел СІКОРСКІ.

ЯШЧЭ здалёк учора — ажно ад станцыі метрапалітэна «Няміга» — увагу ў небе (!) над дастаткова высокім будынкам выстаўчнага павільёна па вуліцы Янкі Купалы, 27 прыцягвалі ўзнятыя стрэлы спецыяльнай будаўнічай тэхнікі. Тут, на адкрытай пляцоўцы, у рамках выставы «Будэкспа-2011. Беларускі будаўнічы рынак прапануе» было выстаўлена абсталяванне, тэхніка — усё, што звязана з сучасным будаўніцтвам і рамонтам. Навокал, калі прыслухацца, можна пачуць ці не з дзясятак замежных моў: больш за 300 кампаній з 11 краін свету вырашылі прадставіць свае тэхналогіі ў будаўніцтве, тэхніку і абсталяванне, а таксама будматэрыялы на сёлетнім форуме. Акрамя буйнейшых айчынных кампаній, якія годна і ў шырокім асартыменце прадстаўляюць будаўнічую галіну, свае прапановы і распрацоўкі дэманструюць кампаніі з Расіі, Украіны, Польшчы, Фінляндыі, Ізраіля, Ірана, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Італіі.

...Фактычна з самай раніцы ўнутры павільёна, як і на адкрытай пляцоўцы, не менш шматлюдна. Пакуль ён канчаткова не запоўніўся спецыялістамі-прафесіяналамі, простымі наведнікамі, імкнёмся як мага хутчэй разглядзець, сфатаграфаваць самае цікавае, распытаць пра навінкі прадстаўнікоў фірмаў, арганізацый, прадпрыемстваў.

— Сапраўды, выстава яшчэ афіцыйна не адкрылася, а да нашага стэнда многія падыходзяць, цікавяцца, фатаграфуюць, — пацвярджае нашу здагадку пра відовішчнасць макета намеснік начальніка аддзела інфармацыйнага забеспячэння РУП «Будтэхнорм» Алена КАНЬКОВА.

Маркетолаг Юля ЗЯБЛАВА і прадавец Алеся ЖДАНОВІЧ дэманструюць навінку ад Мінскага завода будаўнічых матэрыялаў: парызаваныя керамічныя блокі.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.03.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼ 1 долар ЗША	3 019,00	1 чэшская крона	175,59	USD	28,1561
▲ 1 еўра	4 298,75	1 польскі злоты	1 065,69	10 UAH	35,4053
1 латвійскі лат	6 067,73	▲ 1 расійскі рубель	107,22	1000 BYR	9,3201
1 літоўскі літ	1 244,56	1 украінская грыўня	379,61	EUR	40,0858

ОКПО 00312136 УНН 100097980

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ОАО «АКТАМИР» за 2010 год

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС ПО СОСТОЯНИЮ на 01.01.2011 г. *(млн руб.)*

Наименование показателя	Код строки	ОАО «Актамир» на конец отчетного периода
АКТИВ		
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Основные средства:		
первоначальная стоимость	101	7 182
амортизация	102	4 855
остаточная стоимость	110	2 327
Нематериальные активы		
первоначальная стоимость	111	2
амортизация	112	1
остаточная стоимость	120	1
Доходные вложения в материальные ценности		
первоначальная стоимость	121	27 190
амортизация	122	17 298
остаточная стоимость	130	9 892
Вложения во внеоборотные активы	140	2 587
в том числе: незавершенное строительство	141	2 583
ИТОГО по разделу I	**190**	**14 807**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ		
Запасы и затраты	210	423
в том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	120
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	13
расходы на реализацию	214	
готовая продукция и товары для реализации	215	39
товары отгруженные	216	231
расходы будущих периодов	218	20
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	5
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	379
в том числе: покупателей и заказчиков	241	192
поставщиков и подрядчиков	242	79
по налогам и сборам	243	9
по расчетам с персоналом	244	-
разных дебиторов	245	99
прочая дебиторская задолженность	249	-
Денежные средства	260	2 581
в том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	2 263
Финансовые вложения	270	502
Прочие оборотные активы	280	27
ИТОГО по разделу II	**290**	**3 917**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**18 724**
ПАССИВ		
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ		
Уставный фонд	410	280
Добавочный фонд	430	17 669
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	497
Доходы будущих периодов	470	
ИТОГО по разделу III	**490**	**18 446**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА		
Краткосрочные кредиты и займы	610	
Кредиторская задолженность	620	171
в том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	33
перед покупателями и заказчиками	622	26
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	35
по прочим расчетам с персоналом	624	
по налогам и сборам	625	64
по социальному страхованию и обеспечению	626	6
перед прочими кредиторами	628	7
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	107
в том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	107
ИТОГО по разделу V	**690**	**278**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**18 724**
Из строки 620: краткосрочная кредиторская задолженность	702	171

Информация об открытом акционерном обществе «Актамир» и его деятельности

5. Количество акционеров, всего	лиц	3 044
в том числе:		
юридических лиц	лиц	1
физических лиц	лиц	3 043

6. Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн руб.	764,0
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	2 728,57
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	65,9
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	нет

7. Просроченная дебиторская задолженность	млн руб.	-
8. Просроченная кредиторская задолженность	млн руб.	-
9. Среднесписочная численность работающих	человек	42
10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг:	1. Сдача внаем собственного недвижимого имущества	

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 01 января 2010 г. по 31 декабря 2010 г.

(млн руб.)

Наименование показателей	Код строки	ОАО «Актамир» за отчетный период
1	2	
1. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	4 630
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	651
Выручка от реализации товаров, продукции, работ и услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	3 979
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	2 614
Валовая прибыль (020-021-030)	040	1 365
Управленческие расходы	050	
Расходы на реализацию	060	224
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**1 141**
2. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Операционные доходы	080	368
Налоги и сборы, включаемые в операционные доходы	081	3
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	365
в том числе:		
проценты к получению	091	212
доходы от участия в создании (учредительстве) других организаций	092	1
доходы от операций с активами	093	133
прочие операционные доходы	099	19
Операционные расходы	100	133
В том числе: проценты к уплате	101	
расходы от операций с активами	102	133
Прочие операционные расходы	**109**	
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	**120**	**232**
3. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ		
Внереализационные доходы	130	167
Налоги и сборы , включаемые во внереализационные доходы	131	1
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	166
Внереализационные расходы	150	291
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	**160**	**-125**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070±120±160)	**200**	**1 248**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	167
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)	**240**	**1 415**
Налог на прибыль	250	301
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	222
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**725**
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	
Прибыль (убыток) на акцию (в рублях)	320	2 590
Количество прибыльных организаций/ сумма прибыли	330	

Аудиторское заключение АООО «Аудиториз» от 09.03.2011 по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Актамир»:

«По нашему мнению, за исключением влияния на бухгалтерскую (финансовую) отчетность того аспекта, что мы не наблюдали за проведением инвентаризации товарно-материальных ценностей ОАО «Актамир» перед составлением годовой бухгалтерской отчетности и не смогли проверить их наличие посредством других процедур аудита, бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Актамир», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных отношениях отражает финансовое положение ОАО «Актамир» на 1 января 2011 г. и результаты его финансово-хозяйственной деятельности за 2010 год, при этом совершенные ОАО «Актамир» финансовые (хозяйственные) операции соответствуют законодательству».

Генеральный директор ОАО «Актамир» **А.С. Купреев**

Главный бухгалтер ОАО «Актамир» **Л.В. Гвоздик**

КПУП «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор торгов) извещает о проведении *31 марта 2011 года* открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Гос. номер	Наименование оборудования	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Задаток, без НДС, бел. руб.
1	5503 ЕАВ	**Легковой седан Фольксваген Венто – 1997 г.**	**3 245 000**	**300 000**
2	8537 ЕА	**Газ-3307 грузовой фургон – 1999 г.**	**4 620 000**	**400 000**
3	8538 ЕА	**ГАЗель-2705 – 1999 г. – грузопассажирский**	**2 970 000**	**200 000**

Продавец: УП «Гомельоблсоюзпечать», контактный телефон: 74 51 45. **Имущество расположено по адресу:** ул. Ланге, 2а, г. Гомель, 246050.

Шаг аукциона – 5 %. К участию в аукционе допускаются лица, которые своевременно подали заявления на участие в аукционе по форме, определенной организатором аукциона, внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, представили другие необходимые документы и подписали соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Документы на участие в аукционе принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Гагарина, 20, каб. 2-16** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения ***по 30 марта 2011 г. включительно***. Подача документов по почте не допускается.

Задаток для участия в аукционе перечисляется на расчетный счет продавца р/с № 3012000740011 филиал ОАО «БПС-Банк» по Гомельской области, МФО 151501360, УНП 400010817, ОКПО 01195187.

Подробная информация опубликована в газете «Звязда» от 16.02.2011. Контактный телефон организатора аукциона: 74 17 34

Online-канферэнцыя

ТРАКТАРЫ — НЕ ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ

Састарэлая тэхніка, часта нічым не апраўданае «геройства», а таксама ўжыванне на працоўным месцы алкагольных напояў — прычын вытворчага траўматызму вельмі шмат. Але адной з галоўных сярод іх застаецца кепскае інструктаванне работнікаў па тэхніцы бяспекі. Прычым адсутнасць неабходных ведаў — прамы шлях да бяды. Таму невыпадкова, што менавіта тэме навучання ахове працы і была прысвечана чарговая online-канферэнцыя Міністэрства працы і сацыяльнай абароны з удзелам дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Анатоля Пятровіча САДАЎНІЧАГА і начальніка ўпраўлення аховы і дзяржаўнай экспертызы ўмоў працы міністэрства Івана Аляксандравіча КАРЧЭЎСКАГА.

@ З якой перыядычнасцю павінны здаваць экзамены па тэхніцы бяспецы спецыялісты арганізацыі?

— Кіраўнікі і спецыялісты абавязаны прайсці праверку ведаў па ахове працы не пазней чым праз месяц пасля свайго ўладкавання на пасаду. А пазней такія праверкі павінны праходзіць не радзей чым раз у тры гады.

@ Ці абавязаны праходзіць праверку ведаў па ахове працы вартаўнік?

— Абавязаны. Бо ахова аб'ектаў любой формы ўласнасці лічыцца працай з павышанай небяспекай. А работнікі, занятыя працай з павышанай небяспекай, абавязаны праходзіць перыядычную праверку ведаў па ахове працы не радзей аднаго разу ў год.

@ Ці ўсе работнікі павінны праходзіць інструктаж па бяспецы непасрэдна на працоўным месцы?

— Першасны інструктаж на працоўным месцы можа не праводзіцца з асобамі, якія не займаюцца мантажам, эксплуатацыяй, наладкай, абслугоўваннем і рамонтам абсталявання — за выключэннем работ з павышанай небяспекай. Прычым пералік прафесій і пасад работнікаў, якія вызваляюцца ад першаснага інструктажу на працоўным месцы, складаецца службай аховы працы з удзелам прафсаюза і зацвярджаецца кіраўніком арганізацыі.

@ Што чакае работніка, які не прайшоў інструктаж па бяспецы?

— Паводле 49 артыкула Працоўнага кодэкса, работнік, які не прайшоў інструктаж ці праверку ведаў па ахове працы, у адпаведны дзень не дапускаецца да выканання сваіх працоўных абавязкаў. Апроч таго, трэба мець на ўвазе: невыкананне работнікам інструкцый можа з'яўляцца падставай для прызначэння яму пазачарговай праверкі па пытаннях аховы працы.

@ Існуе правіла: у выпадку больш чым 3-гадовага перапынку рабочыя павінны дапускацца да самастойнай працы толькі пасля стажыроўкі пад кіраўніцтвам сваіх калег больш высокай кваліфікацыі. Але як быць у сітуацыі, калі арганізацыя невялікая, і супрацоўнікаў больш высокай кваліфікацыі тут проста няма?

— У такой сітуацыі арганізацыя можа заключыць адпаведны дагавор на правядзенне стажыроўкі з іншай арганізацыяй, якая мае высокакваліфікаваных рабочых са стажам практычнай працы па гэтай прафесіі не менш за 3 гады.

@ З якога ўзросту можна кіраваць трактарам?

— Працаваць на трактарах і іншых самаходных сельгасмашынах могуць асобы, якім споўнілася 17 гадоў, — пры ўмове, што гэтыя асобы маюць пасведчанне на кіраванне такой тэхнікай. Прычым допуск да самастойнай працы на самаходных сельгасмашынах магчымы толькі пасля праверкі ведаў па бяспецы і стажыроўкі пад кіраўніцтвам майстроў, брыгадзіраў ці высокакваліфікаваных рабочых, якія самі маюць стаж падобнай працы не менш за 3 гады.

@ Хто можа прыцягвацца да рамонту і тэхнічнага абслугоўвання сельгасмашын?

— Да рамонтаў і тэхнічнага абслугоўвання сельгасмашын могуць дапускацца асобы, якія маюць адпаведную спецыяльнасць, прафесію, кваліфікацыю і якія прайшлі праверку ведаў па ахове працы.

@ Калі ў арганізацыі павінен працаваць штатны інжынер па тэхніцы бяспекі?

— Паводле 227 артыкула Працоўнага кодэкса, пасады спецыялістаў па ахове працы павінны ўводзіцца наймальнікамі пры колькасці работнікаў больш за 100 у вытворчых і больш за 200 — у іншых галінах. Прычым наймальнік можа прыняць рашэнне аб прызначэнні спецыяліста па ахове працы і пры меншай колькасці супрацоўнікаў.

@ Ці плануецца ў беларускіх ВНУ рыхтаваць спецыялістаў па ахове працы?

— Падрыхтоўка інжынераў па ахове працы на базе сярэдняй адукацыі ўжо вядзецца ў Беларускім дзяржаўным аграрным тэхнічным універсітэце — першы выпуск спецыялістаў тут адбудзецца ў 2012 годзе.

Плюс да таго, у краіне ёсць магчымасць на базе вышэйшай адукацыі прайсці перападрыхтоўку і атрымаць другую спецыяльнасць «Ахова працы». У прыватнасці, такая перападрыхтоўка наладжана ў Беларускім аграрным тэхнічным універсітэце, Беларуска-расійскім універсітэце, Рэспубліканскім інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіраўнікоў і спецыялістаў прамысловасці, Дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у галіне газазабеспячэння, Інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Полацкага дзяржаўнага універсітэта і ў шэрагу іншых навучальных устаноў.

@ Колькі няшчасных здарэнняў у Беларусі адбываецца з-за недахопаў ў навучанні і інструктаванні работнікаў па тэхніцы бяспекі?

— Варта мець на ўвазе, што ў большасці выпадкаў няшчасныя здарэнні адбываюцца не па адной, а адразу па некалькіх прычынах. Тым не менш вынікі спецыяльных расследаванняў інцыдэнтаў паказваюць, што менавіта «недахопамі ведаў» тлумачацца 12-15 працэнтаў выпадкаў вытворчага траўматызму з цяжкімі наступствамі. Так, за апошнія пяць гадоў колькасць смяротных выпадкаў па гэтай прычыне зменшылася ў паўтара раза. Аднак зразумела: цяперашні паказчык усё яшчэ застаецца занадта вялікім.

Сяргей ГРЫБ.

ГЕНПРАКУРАТУРА ВЫНЕСЛА ПАПЯРЭДЖАННІ АСОБНЫМ МІНІСТЭРСТВАМ

Генеральная пракуратура прааналізавала стан работы па барацьбе з карупцыяй у міністэрствах краіны. Двум з іх, а дакладней службовым асобам, якія адказваюць за арганізацыю работы па папярэджанні і супрацьдзеянні карупцыі, вынесены афіцыйныя папярэджанні. У гэтым спісе, у прыватнасці, Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, Міністэрства прамысловасці.

Паводле слоў начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем заканадаўства па барацьбе з карупцыяй і арганізаванай злачыннасцю Генпракуратуры Ігара ГРЭЙБЫ, у названых міністэрствах на працягу апошніх гадоў захоўваецца высокі ўзровень карупцыйнай злачыннасці. Так, у сістэме Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва ў 2009-2010 гадах выяўлена звыш 160 карупцыйных злачынстваў, а ў студзені-лютым 2011 годзе — ужо 24. На працягу апошніх гадоў узровень карупцыі застаецца таксама высокім і ў арганізацыях Міністэрства прамысловасці. Так, калі ў 2009 годзе было выяўлена 28 карупцыйных злачынстваў, то ў 2010 годзе — ужо 85 такіх злачынстваў, за студзень-люты 2011 года -14. Да крымінальнай адказнасці па справах аб карупцыі летась прыцягнута 58 чалавек; для параўнання, у 2009 годзе — 11. Найбольш распаўсюджанымі застаюцца такія небяспечныя формы карупцыі, як хабарніцтва, злоўжыванне ўладай ці службовымі паўнамоцтвамі, у тым ліку і спалучаныя з крадзяжамі маёмасці. Карупцыйныя злачынствы ў сістэме Мінпрама, як правіла, здзяйсняюцца пры правядзенні закупак, здачы памяшканняў у арэнду, заключэнні дагавораў пастаўкі прадукцыі, выкананні будаўнічых работ, распараджэнні грашовымі сродкамі.

У Генпракуратуры спадзяюцца, што пасля атрымання папярэджанняў камісіі па каардынацыі ведамаснага кантролю і папярэджанні карупцыі названых міністэрстваў актывізуюць сваю дзейнасць па прыняцці належных мер, накіраваных на барацьбу з карупцыяй.

Акрамя таго, афіцыйнае папярэджанне — але ўжо за парушэнне заканадаўства аб дэклараванні даходаў — вынесена Міністэрству гандлю.

Надзея ДРЫЛА.

«БЕЛНАФТАХІМ» ПРЫМЕ МЕРЫ ДЛЯ СТРЫМАННЯ ВЫВАЗУ ЗА МЯЖУ БЕНЗІНУ І ДЫЗПАЛІВА

Канцэрн «Белнафтахім» вымушаны прымаць меры, каб не дапусціць далейшага павелічэння вывазу за мяжу бензіну і дызпаліва, набытых на беларускіх АЭС, і нанясення ўрону эканоміцы краіны, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе канцэрна. У прыватнасці, у бліжэйшы час плануецца абмежаваць колькасць паліва, што адпускаецца на АЗС.

У прэс-службе растлумачылі, што розніца ў цэнах на аўтамабільнае паліва ў Беларусі і сумежных дзяржавах абумовіла значны рост яго рэалізацыі ў прыгранічных раёнах краіны. Так, у студзені-лютым гэтага года на прыгранічных АЗС Брэсцкай вобласці тэмп росту рэалізацыі дызельнага паліва склаў 153 працэнты да аналагічнага перыяду 2010-га, у Віцебскай вобласці — 127 працэнтаў, у Гомельскай — 198 працэнтаў. У цэлым па рэспубліцы рост рэалізацыі дызельнага паліва на АЗС канцэрна ў студзені-лютым склаў 128 працэнтаў да адпаведнага перыяду мінулага года.

«Як паказваюць аператыўныя весткі, не зніжаецца рост рэалізацыі маторнага паліва на прыгранічных АЗС і ў сакавіку», — падкрэслілі ў прэс-службе «Белнафтахіма». У гэтым месяцы ў сувязі з павышэннем цаны на нафтавую сыравіну на сусветным рынку адбываецца значнае і хуткае падаражанне маторнага паліва ў краінах — суседзях Беларусі.

Напрыклад, паводле звестак на 18 сакавіка, цана аднаго літра дызельнага паліва ў Літве перавышае цану на беларускіх АЗС на 85 працэнтаў, у Латвіі — на 92 працэнты, у Польшчы — на 80 працэнтаў, ва Украіне — на 21 працэнт. Кошт бензіну AI-95 на АЗС у Літве вышэйшы, чым у Беларусі, на 61 працэнт, у Латвіі — на 57 працэнтаў, у Польшчы — на 53 працэнты, ва Украіне — на 7 працэнтаў. Адзін літр бензіну AI-92 ва Украіне на 18 працэнтаў даражэйшы, чым у Беларусі...

«ХАТЫНЬ»: ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ

ДЗЕНЬ памяці прайшоў 22 сакавіка ў мемарыяльным комплексе «Хатынь», паведаміў дырэктар комплексу Артур Зельскі. Раней адбыўся круглы стол, прымеркаваны да дня хатынскай трагедыі і прысвечаны памяці беларускіх вёсак, знішчаных разам з насельніцтвам у гады Вялікай Айчыннай вайны, перадае БЕЛТА.

Дзень памяці быў прызначаны на 22 сакавіка невыпадкова: менавіта ў гэты дзень у 1943 годзе ў Хатыні, якая стала сімвалам трагедыі ўсяго беларускага народа, і былі спалены жыхары вёскі. На Дні памяці прысутнічалі ветэраны, школьнікі, прадстаўнікі Фонду міру, стваральнікі комплексу «Хатынь», а таксама двое сведак трагедыі.

Акрамя таго, напярэдадні 70-годдзя пачатку Вялікай Айчыннай вайны грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд міру» пачало рэалізацыю міжнароднага праекта «Павышэнне статусу ўцалелых жыхароў спаленых беларускіх вёсак».

Адна з праблем, якую закранулі ўдзельнікі круглага стала, — тое, што да Хатыні да гэтага часу не ходзяць аўтобусы і дабрацца туды тым, у каго няма асабістага аўтамабіля, бывае вельмі праблематычна: для гэтага неабходна звяртацца ў турагенцтва, якое арганізуе экскурсіі. Акрамя таго, мемарыяльным комплексам «Хатынь», які раней знаходзіўся ў падпарадкаванні Міністэрства культуры і з'яўляўся аб'ектам рэспубліканскай значнасці, цяпер кіруюць мясцовыя органы ўлады,

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

што, на думку ўдзельнікаў круглага стала, недапушчальна. «Хатынь — сімвал Беларусі, хочам мы гэтага ці не. Наша Хатынь — гэта наша памяць», — падкрэсліў адзін з аўтараў мемарыяльнага комплексу заслужаны архітэктар Беларусі Леанід Левін.

Нацыянальным архівам Беларусі таксама будзе выдадзена кніга, прысвечаная трагедыі беларускіх вёсак, дзе ўпершыню будзе апублікаваны каля 200 важных архіўных дакументаў. Рукапіс кнігі ўжо гатовы, плануецца, што яна выйдзе ў чэрвені гэтага года. Беларусь моцна пацярпела ад нацызму: загінуў кожны трэці жыхар краіны. Амаль 9,2 тыс. вёсак былі спалены нацыстамі, больш як 600 — спалены датла разам з мясцовым насельніцтвам.

БЕЛАРУСКІ БУДАЎНІЧЫ РЫНАК ПРАПАНУЕ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэтае прадпрыемства (як арганізатар) прадстаўляе на будаўнічым форуме калектыўную экспазіцыю Мінбудархітэктуры — макет аздараўленчага санаторыя на Нарачы. Дарэчы, ён узгоднены з кіраўніком дзяржавы, і менавіта ў такім выглядзе праз нейкі час усе гэтыя дамы-катэджы, зоны адпачынку павінны ў рэальнасці з'явіцца ў курортным пасёлку.

— Вырабляць і выстаўляць макеты як пацвярджэнне пэўных дасягненняў — звычайная практыка. Нас цікавіць меркаванне як звычайных наведнікаў выставы, так і прафесіяналаў, тым больш што на форуме прысутнічаюць і замежныя нашы калегі, — гаворыць Алена.

ААТ «Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў» бярэ пачатак сваёй гісторыі яшчэ з 1925 года. У будаўнічых выставах — і ў нашай краіне, і за яе межамі — удзельнічае пастаянна. Прадпрыемства спецыялізуецца на будаўнічай кераміцы: мае самы шырокі асартымент цэглы — і фасаднай, і радавой, і паўнацелай, і пустацелай... На сёлетні форум Мінскі завод будаўнічых матэрыялаў прывёз навінку, якая толькі другі год вырабляецца ў краіне (яшчэ толькі ААТ «Радашковіцкі керамічны завод выпускае аналагічную) — парызаваныя (ад слова — поры) керамічныя блокі.

— Матэрыял адказвае сучасным тэндэнцыям энергазберажэння, да таго ж эканоміць час на кладку. Выкарыстоўваць керамічныя парызаваныя пустацелыя блокі можна ў абароненай кладцы саманясучых і ненясучых вонкавых і ўнутраных сцен збудаванняў і будынкаў, для запаўнення каркасаў, — расказвае маркетолаг завода Юля ЗЯБЛАВА. — Іншымі словамі, найбольш яны падыходзяць — з-за не вельмі высокай мяжы трывалаці — для прыватнага будаўніцтва, хоць могуць быць выкарыстаныя і пры панэльным будаўніцтве.

Па нашай просьбе прадавец Алеся ЖДАНОВІЧ падлічвае «цану пытання» — наколькі названыя блокі, як кажуць, па кішэні спажыўцу. Мяркуйце самі. Блокі на нямецкай лініі вырабляюцца трох памераў: 510x250x219, 380x250x219, 250x120x138 мм. Дык вось, набываць іх можна нават паштучна. У гэтым выпадку, напрыклад, пакупніку адзін блок першага названага памеру будзе каштаваць 6 130 рублёў, другога па ліку — 4 570 рублёў. Прычым, аддаўшы перавагу першаму варыянту, можна будзе абысціся і без дадатковага ўцяплення сцен. А вось набыць гэтую прадукцыю-навінку можна толькі ў Мінску — у фірменнай краме завода па адрасе Гурскага, 10А.

Пастаянны ўдзельнік выстаў — і ААТ «Гродзенскі шклозавод». Прычым, прадпрыемства не проста фармальна ўдзельнічае ў спецыялізаваных форумах, а ўвесь час імкнецца паказаць нешта новае. На сёлетнюю веснавую выставу ў сталіцы гарадзенцы таксама прыехалі, як кажуць, не з пустымі рукамі.

— Гэта — новае ўзорыстае шкло для запаўнення дзвярэй, праёмаў, вокнаў, кухоннай мэблі, — дэманструе ўзоры інжынер па маркетынгу адкрытага акцыянернага таварыства Павел СІКОРСКІ. — Сама навінка тут — у новых лініях узораў на шкле. Мы год працавалі над імі, былі ўстаноўлены замежныя лініі, адпаведна, для новых малюнкаў на шкле заказваліся і адмысловыя валы.

Шкада, што нельга на словах расказаць падрабязна пра тыя ўзоры, не вельмі дапаможа і фотаздымак. Таму чытачам застаецца толькі паверыць на слова: калі вы будзеце шукаць, чым зашкліць міжпакаёвыя дзверы ці аздобіць кухонныя дзверцы і вам на вочы патрапіць навінка ад гродзенскага прадпрыемства, яна вам спадабаецца. Адзінае, трэба будзе пачакаць, бо новае ўзорыстае шкло пакуль яшчэ не вырабляецца, у продажы яго няма, існуе яно толькі ў выглядзе ўзораў пад працоўнымі нумарамі 47 і 43. Мяркуецца, што адпускная аптовая цана на навінку складзе каля 18 тысяч рублёў за квадратны метр.

У Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэце будзе наладжана падрыхтоўка па спецыяльнасцях «сельскае будаўніцтва і ўладкаванне тэрыторый» і «машыны і апараты харчовых вытворчасцяў», а ў Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна на спецыяльнасці «сучасныя замежныя мовы» адкрыецца спецыялізацыя «Камп'ютарная лінгвістыка».

У Беларускім дзяржаўным універсітэце ў юбілейны год на фізічным факультэце адкрываецца спецыяльнасць «фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій».

Надзея НІКАЛАЕВА.

Як удзельніку рэпетыцыйнага тэсціравання атрымаць індывідуальную кансультацыю?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Рэгістрацыя для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні распачнецца 4 мая 2011 года. Для таго, каб зарэгістравацца, вам неабавязкова ехаць у Беларусь. Можна будзе адправіць заяву вызначанай формы поштай на адрас пункта правядзення цэнтралізаванага тэсціравання? аднак заява павінна паступіць не пазней чым 1 чэрвеня — да заканчэння тэрміну рэгістрацыі. Да заявы прыкладаюцца ксеракопія дакумента, які сведчыць асобу ўдзельніка ЦТ (старонкі з установачнымі звесткамі). Рэгістрацыйны ўзнос за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ можна аплаціць, калі прыедзеце ў Беларусь, а квітанцыю прад'явіць пры атрыманні пропуска. Пропуск выдаецца па тым жа адрасе, па якім была накіравана па пошце заява. Узор заявы можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў **www.rikz.unibel.by.** Пункты рэгістрацыі і правядзення ЦТ таксама з'явяцца на сайце інстытута, але крыху пазней — у красавіку.

— Дапамажыце даведацца, ці можна на рэпетыцыйным тэсціраванні «трэніравацца» па адным прадмеце больш за адзін раз. Я маю на ўвазе кожны з этапаў тэсціравання. Ці ўсім удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання прапануецца адзін і той жа варыянт тэста?

— У ходзе правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання на кожным з яго этапаў можна двойчы праэкзаменаваць свае веды па наступных прадметах: рускай і беларускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, біялогіі, англійскай мове, гісторыі Беларусі, паколькі менавіта па гэтых дысцыплінах Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў дае для «рэпетыцыі» па два варыянты тэстаў. Аднак калі вы пажадаеце ўдзельнічаць у рэпетыцыйным тэсціраванні ў другі раз, трэба будзе папярэдне праінфармаваць адказнага арганізатара аб тым, што вы ўжо выконвалі, напрыклад, першы варыянт тэста. У гэтым выпадку вам прапануюць другі варыянт. Аднак абавязковай умовай з'яўляецца аплата за ўдзел у тэсціраванні: 16 100 рублёў за адну спробу і столькі ж — за другую.

— Наколькі я ведаю, у БДУ пасля правядзення рэпетыцыйнага тэсціравання практыкуюць кансультацыі з разборам найбольш характэрных памылак. А як быць абітурыентам з іншых рэгіёнаў? Калі на рукі атрымліваеш толькі «плюсы» і «мінусы» за правільна выкананыя ці нявыкананыя заданні, якая ад гэтага карысць? Нават змест тэста аднавіць немагчыма.

— Рэгіянальны цэнтр тэсціравання і прафесійнай арыентацыі моладзі пры Гродзенскім дзяржаўным універсітэце ўжо не першы год арганізуе пры падтрымцы Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў індывідуальныя кансультацыі для ўдзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання. Там могуць пракансультаваць любога абітурыента, незалежна ад пункта праходжання тэсціравання і месца яго жыхарства. Мэта такой кансультацыі — ліквідацыя прабелаў у ведах і далейшая падрыхтоўка па тэматыцы тэставых заданняў, з якімі абітурыенты не справіліся на «рэпетыцыі» экзамена. Індывідуальная кансультацыя ўяўляе сабой рассылку вучэбна-метадычнага пакета, які ўтрымлівае тэматыку раздзелаў школьнай праграмы па кожным няправільна выкананым заданні з указаннем года ці класа вывучэння адпаведнага раздзела, з рэкамендаваным спісам вучэбнай і метадычнай літаратуры, са зместам няправільна выкананых заданняў, з правільнымі адказамі і ўказаннем да правільнага рашэння. Кошт кансультацыі па адным прадмеце складае 14 100 рублёў. Больш поўную інфармацыю можна атрымаць або на сайце Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта **www.grsu.by,** або па тэлефонах (0152) 74 14 86, 73 01 01. Трэба дадаць, што паказчык паспяховасці абітурыентаў, якія скарысталіся індывідуальнай кансультацыяй па выніках усіх трох этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання, намнога вышэйшы на цэнтралізаваным тэсціраванні, чым сярэдні бал па Гродзенскай вобласці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12 ад 19 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар Уладзімір НАРКЕВІЧ.
Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Анатоль СЛАНЕЎСКІ.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактны тэлефон: 292-44-12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 33.380. Нумар падпісаны ў 19.30.

Быць здаровым — проста модна!

Кажуць, здароўе — самае вялікае багацце. Спрачацца з гэтым сапраўды нельга. Аднак, маладыя людзі, як ні дзіўна, зусім не звяртаюць на гэта выказванне ўвагі. І адпачынку на свежым паветры аддаюць перавагу камп'ютарным гульням, прагляду фільмаў ці нават баўленню часу з цыгарэтай.

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі імкнецца змяніць стаўленне моладзі да ўласнага здароўя і асаблівую ўвагу адводзіць прапагандзе здаровага ладу жыцця. На гэты раз маладзёжны саюз у рамках руху «Я люблю цябе, жыццё!» упершыню правёў маладзёжны спартыўна-творчы фестываль «Будзь здаровы!». Ён прайшоў на тэрыторыі гарналыжнага спартыўна-аздараўленчага комплексу «Лагойск».

У фестывалі прынялі ўдзел каманды пярвічных арганізацый БРСМ. Актыўная, спартыўная і творчая моладзь падчас мерапрыемства праявіла спрытнасць, «пачуццё локця» ў спаборніцтвах па фестывальным валейболе, жартоўным біятлоне, у вясеннім першынстве па перацягванні каната. Усе спартыўныя спаборніцтвы прайшлі па алімпійскай сістэме. Цяжэй за ўсё было вызначыць пераможцу ў конкурсе па прыгатаванні самага смачнага і лепшага шашлыка. Тут улічваліся і смакавыя якасці, і арыгінальнасць афармлення стравы.

У выніку самай спартыўнай і творчай аднагалосна прызнана каманда галіноваga камітэта БРСМ «Белаграпрамбанка». На шляху да пераможнага алімпу юнакі і дзяўчаты праявілі актыўнасць, напорыстасць і камандны дух. Другое месца па выніках турнірнай таблицы ў каманды пярвічнай арганізацыі БРСМ Міністэрства ўнутраных спраў, трэцяе — у пярвічнай арганізацыі Міністэрства прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя.

Як адзначылі арганізатары, нягледзячы на тое, што надвор'е было не зусім вясновым, моладзь катаклізмаў прыроды зусім не заўважала. На фэсце ў Лагойску панавала творчая, спартыўная, дружалюбная атмасфера. У БРСМ пэўнены, што арганізацыя такіх фестываляў дае магчымасць маладым людзям не толькі праявіць свае творчыя і інтэлектуальныя здольнасці, рэалізаваць сябе ў спартыўных спаборніцтвах, атрымаць станоўчыя эмоцыі, з'яднаць калектыў, але і, што асабліва немалаважна, набыць новых сяброў. Бо, згадзіцеся, калі за справу бярэцца актыўная і ініцыятыўная моладзь станоўчы вынік не прымусіць сябе чакаць.

Святлана СУХАРКО.

Генеральны дырэктар ААТ «МАЗ» Аляксандр БАРОЎСКІ:

«У НАС ДЫРЭКТАРАМІ СТАНОВЯЦЦА Ў 30-40 ГАДОЎ»

На Мінскім аўтамабільным заводзе адбыўся дзень адчыненых дзвярэй для будучых маладых спецыялістаў. Студэнты, якія неўзабаве скончаць універсітэты, сустрэліся з генеральным дырэктарам ААТ «МАЗ» Аляксандрам Бароўскім і наведаліся на вытворчасць (дарэчы, упершыню можна было ўбачыць аўтобусны цэх). Кіраўнік аўтазавода расказаў пра тое, што чакае новых работнікаў і якія перспектывы развіцця ёсць у МАЗа пры супрацоўніцтве з расійскім КамАЗам.

Возьмуць каля 200 маладых спецыялістаў

У 2011 годзе на МАЗ плануюць узяць каля 200 маладых спецыялістаў, выпускнікоў БНТУ, БДУІРа, БДЭУ, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Беларусі і іншых вышэйшых навучальных устаноў. Асноўныя спецыяльнасці, па якіх будуць прымаць работнікаў: тэхналогія машынабудавання, аўтамабілебудаванне, машыны і тэхналогія апрацоўкі матэрыялаў ціскам, праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій, тэхналогія лакафарбавых матэрыялаў і іншыя.

Дзяўчат бяруць мала

«Я гляджу, тут чамусьці вельмі шмат дзяўчат. Але ж вы не пацягнеце працу майстраў. Хацелася б бачыць больш хлопцаў, бо для дзяўчат у нас ёсць толькі дзесьці 5 вакансій бухгалтара — і ўсё», — сказаў Аляксандр Васільевіч на пачатку сустрэчы, калі ўбачыў у зале вялікую колькасць студэнтак.

Сярэдні заробак на «МАЗе» — каля 2,5 млн

«Я раблю стаўку на моладзь. Умовы для добрай працы маладых створаны. Тых, хто прыйдзе да нас, чакае інтэрнат, добры заробак, гатовыя пасады. А праз пяць гадоў вы зможаце атрымаць кватэру, — заахвочваў Аляксандр Бароўскі. — Сярэдні заробак сёння на «МАЗе» — 2,5 млн рублёў». Але потым гендырэктар папярэдзіў, што пачынаць усім трэба будзе з майстраў: «Усе хлопцы пойдуць на вытворчасць. А ўжо адтуль яны змогуць расці далей. Мне патрэбны майстры, хлопцы, якія будуць вельмі хутка расці. У нас дырэктарамі становяцца ў 30-40 гадоў. Мы не хочам, каб вы ўсё жыццё працавалі майстрамі. Вы пачніце з вытворчасці, а далей пойдзеце ў кіраўнікі. Такая сістэма працуе, напрыклад, у Японіі і паказвае добрыя вынікі».

Аб паляпшэнні якасці і супрацоўніцтве з КамАЗам

Сёлета збіраемся 50 млн долараў выдаткаваць на паляпшэнне якасці нашай прадукцыі, — адзначыў кіраўнік «МАЗа». — Мы імкнёмся да еўрапейскай якасці, але па беларускіх цэнах. Я разумею, што якасці «Мерседэса» і «Вольва» мы яшчэ не дасягнулі. Для гэтага нам патрэбны час і вялікія ўкладанні».

«Вельмі цяжкае становішча сёння. Расія збіраецца ўвайсці ў Сусветную Гандлёвую арганізацыю. А праз гэта павялічацца пастаўкі ў Расію заходняй аўтамабільнай прадукцыі. Да таго ж зараз вельмі актыўна развіваецца Кітай. У такой сітуацыі добра мець партнёра, — растлумачваў Аляксандр Бароўскі прычыны аб'яднання з КамАЗам. — Будзе створаны холдынг, у які мы ўкладзём 48% сваіх акцый, 48% — КамАЗ, плюс яшчэ некалькі заводаў. «Мерседэс» зараз валодае 10% КамАЗа. Ёсць інфармацыя, што праз тры гады «Мерседэс» будзе валодаць 40% КамАЗа. А «Мерседэс» — гэта новыя тэхналогіі, якіх нам так не хапае».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Управляющий **ОДО «Армеец»** (г. Минск, УНН 100185491) реализует имущество предприятия-банкрота путем заключения прямых договоров купли-продажи (строительные материалы, оборудование для производства работ).

С перечнем реализуемого имущества можно ознакомиться, предварительно связавшись с кладовщиком ОДО «Армеец» Сушко Дмитрием Ивановичем, контактный телефон: 8 029 699 50 72.

В случае заинтересованности в приобретении большого количества имущества может быть рассмотрен вопрос о предоставлении скидки.

04 апреля 2011 года в 15.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров **ОАО «Брестский завод бытовой химии».**

Повестка дня:

1. О сделках общества.
2. О приобретении акций на баланс Общества.

Собрание будет проходить по адресу: ***г. Брест, ул. Белорусская, 51. Начало регистрации участников собрания — 14.30.***

УНП 200050518

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ «ЛІШНЯЙ» НЕ БЫВАЕ

Павелічэнне попыту на працоўную сілу і змяншэнне колькасці грамадзян, якія стаяць на ўліку ў службах занятасці насельніцтва. Апошнім часам такая тэндэнцыя назіраецца па ўсёй Беларусі, прычым Мінск тут не з'яўляецца выключэннем. Як сведчыць статыстыка, за мінулы год узровень зарэгістраванага беспрацоўя ў буйнейшым горадзе краіны знізіўся з 0,4 да 0,3 працэнта. Аднак сцвярджаць, што на рынку працы не існуе аніякіх праблем, нельга. Амаль палова сталічных беспрацоўных мае ўзрост да 29 гадоў. Таму, адзначаюць у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, менавіта маладым людзям варта ведаць усе магчымыя варыянты ўладкавання.

Звесткі абнаўляюцца штодзень

Ці не самы просты шлях — пашукаць сабе месца самастойна. Прычым у Мінску зрабіць гэта можна ў тым ліку праз інтэрнэт (сайт www.minsk.gov.by) або праз аддзелы працаўладкавання. І ў тым, і ў другім выпадку ёсць магчымасць абсалютна бясплатна скарыстацца агульнагарадскім банкам вакансій. І, да слова, гэты інфармацыйны банк абнаўляецца кожны дзень.

— Апроч таго, калі штосьці не атрымліваецца, то ў аддзеле працаўладкавання любога раёна можна падысці да спецыяліста і папрасіць дапамагчы з падборам вакансій, — адзначае намеснік начальніка аддзела арганізацыі работ па садзейнічанні занятасці насельніцтва камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Марына Шахловіч. — А ў выпадку, калі чалавек знаходзіцца ў службе занятасці на ўліку, той жа спецыяліст нават абавязкова звяжацца з наймальнікам і паспрабуе ўзгадніць з ім кандыдатуру прэтэндэнта на свабоднае месца.

Дарэчы, цікава: цяпер наймальнікі сталіцы прапануюць для ўладкавання больш за 17,3 тыс. вакансій. У Мінску традыцыйна захоўваецца высокі попыт на рабочых будаўнічых спецыяльнасцяў, вадзіцеляў, машыністаў, слесараў, станочнікаў, мантажнікаў, электрыкаў, электраманцёраў, зваршчыкаў, медсёстраў, гандляроў, касіраў-кантралёраў, повараў, афіцыянтаў, швачак, кандуктараў, у горадзе адчуваецца дэфіцыт урачоў-тэрапеўтаў, фельчараў, інжынераў асобных кваліфікацый, выхавацеляў, а таксама спецыялістаў іншых кваліфікацый — у прыватнасці, па маркетынгу, менеджменце, рэкламе, аўтаматызаваных сістэмах кіравання.

А ВНУ — і ў завочным фармаце

Галоўная ўмова для атрымання працоўнага месца — наяўнасць пэўнай падрыхтоўкі. Аднак практыка сведчыць, што часта якраз тут узнікаюць праблемы. Дастаткова вялікая колькасць маладых людзей або не мае ўвогуле, або мае незапатрабаваную на рынку працы спецыяльнасць.

— У такім выпадку маладым людзям ва ўзросце больш за 16 гадоў для пачатку трэба падысці ў аддзел працаўладкавання па месцы пастаяннай рэгістрацыі і зарэгістравацца ў якасці беспрацоўнага, — раіць Марына Шахловіч. — Працэдура гэта нескладаная, дастаткова прынесці пашпарт, атэстат ці іншы дакумент аб адукацыі, а пры наяўнасці — таксама працоўную кніжку. Пры гэтым статус беспрацоўнага дазваляе не толькі атрымліваць дапамогу, але і адкрывае дадатковыя магчымасці. У прыватнасці, беспрацоўны можа прайсці прафесійную кансультацыю, а пасля пры жаданні і адсутнасці медыцынскіх проціпаказанняў — атрымаць накіраванне на курсы.

Навучанне на курсах працягваецца ад 2 да 11 месяцаў. А надалей вялікіх праблем з уладкаваннем звычайна не ўзнікае: службы занятасці прапануюць асвоіць найбольш запатрабаваныя на рынку спецыяльнасці — адміністратара, бухгалтара, вадзіцеля пагрузчыка, кабельшчыка-спайшчыка, кладаўшчыка з веданнем бухгалтэрыі, кандытара, кантралёра-касіра і гандляра, кранаўшчыка, маляра, тынкоўшчыка, абліцоўшчыка-плітачніка, мантажніка санітарна-тэхнічных сістэм, аператара кацельнай, афіцыянта, бармена, буфетчыка, повара, прадпрымальніка, сакратара-справавода, слесара па рамонце аўтамабіляў, электрагазазваршчыка, электраманцёра па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Варта таксама адзначыць, што на навучанне па некаторых з гэтых спецыяльнасцяў медыкі даюць дазвол інвалідам. Да таго ж сёлета ў Мінску для людзей з абмежаванымі магчымасцямі плануецца стварыць спецыяльную групу — з прапановай асвоіць справу аператара ПЭВМ.

— Няцяжка заўважыць, што гаворка ідзе аб навучанні па рабочых спецыяльнасцях, тады як значная частка моладзі скіраваная на атрыманне вышэйшай адукацыі, — распавядае Марына Шахловіч. — Аднак адмаўляцца ад прапаноў службы занятасці ўсё ж не трэба. Бо «лішняй» прафесійнай падрыхтоўкі ніколі не бывае, у жыцці можа спатрэбіцца ўсё. А плюс да таго, ніхто не перашкодзіць маладому чалавеку зарэгістравацца беспрацоўным, пайсці па накіраванні службы занятасці на курсы і пры гэтым — вучыцца ў ВНУ завочна.

Калі з вопытам праблема?

Не менш складаная тэма. «Патрэбная» наймальніку спецыяльнасць нібыта ёсць, а вось вопыту працы — не. Прычым калі-нікалі менавіта апошняя акалічнасць становіцца падставай для адмовы ад вакансіі.

— У такой сітуацыі таксама ёсць выйсце, — падкрэслівае Марына Шахловіч. — Так, беспрацоўны малады чалавек можа звярнуцца са сваёй праблемай у службу занятасці, а ў сваю чаргу, служба занятасці прапануе наймальніку варыянт моладзевай практыкі. Прасцей кажучы, у рамках гэтай праграмы пазабюджэтным арганізацыям прапануюць заключыць працоўны дагавор на тэрмін да 6 месяцаў і ў якасці стымулу ўвесь гэты час кампенсаваць наймальнікам выдаткі на выплату маладому чалавеку часткі зарплаты ў межах «мінімалкі» (на сёння 460 тыс. рублёў) і выдаткі на выплату сацстраху з гэтай сумы. Прычым падобны варыянт дзейнічае. Маладых людзей прымаюць на практыку і, як паказвае вопыт, у палове выпадкаў затым пакідаюць на пастаянным месцы.

Пры жаданні — можна ў бізнэс

Нарэшце, яшчэ адзін шлях занятасці — прадпрымальніцтва. І тут малады беспрацоўны можа разлічваць на дзяржпадтрымку.

— Калі малады чалавек ва ўзросце больш за 18 гадоў мае пэўныя здольнасці, можа прапанаваць цікавы напрамак прадпрымальніцкай дзейнасці і гэты напрамак прызнаюць патрэбным сталіцы, то ён павінен распрацаваць бізнэс-план і прадаставіць яго ў службу занятасці, — кажа Марына Шахловіч. — І калі бізнэс-план зацвердзяць, то ёсць шанц атрымаць субсідыю на пачатак сваёй справы — у гарадах памер такой субсідыі складае 11 бюджэтаў пражыткоўага мінімуму, ці на сёння гэта больш за 3 млн рублёў.

Субсідыя з'яўляецца бязвыплатнай. Аднак трэба мець на ўвазе, што на працягу 3 месяцаў з моманту рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка ці прыватнага ўніtарнага прадпрыемства тут давядзецца даць справаздачу, куды былі накіраваны грошы. Калі яны пайшлі не па прызначэнні, то субсідыю прыйдзецца вярнуць, а да таго ж запляціць пэўны штраф. Такі ж варыянт вяртання прадугледжаны ў выпадку, калі прадпрымальніцкая дзейнасць не здзяйсняецца на працягу 12 месяцаў запар з моманту дзяржаўнай рэгістрацыі без уважлівых прычын.

Сяргей ГРЫБ.

Сезонныя хваробы

Плачуць вочы, свярбіць нос — што такое? ПАЛІНОЗ!

ЗНАДЫХОДАМ цяпла, калі зацвітаюць расліны-алергены, людзі, схільныя да алергічных рэакцый, пачынаюць чхаць і кашляць, не могуць абыходзіцца без насоўкі і ўвогуле адчуваюць сябе дрэнна.

— Так праяўляе сябе сезоннае алергічнае захворванне — паліноз,— расказвае **кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла МАСЛАВА**. — Хвароба заяўляе пра сябе вясной ці летам у перыяд цвіцення дрэў і траў. Паліноз — захворванне вельмі распаўсюджанае, прыкладна 10-20% людзей у свеце маюць гэтую паталогію.

Часцей за ўсё паліноз праяўляецца ў тых, у каго ёсць да гэтага спадчынная схільнасць, а таксама алергічныя рэакцыі на прыём лекавых прэпаратаў ці іншыя алергічныя захворванні. Звычайна хвароба пачынаецца з рыніту, кан'юнктывіту, з'яўляецца сверб павек, слёзацячэнне. Калі своечасова хваробу не дыягнаставаць і не пачаць лячыць, то да сімптомаў далучаецца бранхіяльная астма, могуць быць праяўленні ў выглядзе крапіўніцы, магчымае павышэнне тэмпературы, галаўныя болі, агульная стамляльнасць, слабасць і г.д.

— Ці можна прыняць прафілактычныя меры загадзя, каб пазбегнуць гэтых непрыемнасцяў?

— Безумоўна. Варта ўлічыць, што гэтае захворванне, як і любая алергія, турбуе чалавека тады, калі ёсць кантакт з алергенам. У дадзеным выпадку гэта адбываецца вясной і летам. Заканчваецца вясенне-летні час, і праяўленні хваробы адступаюць. Аднак яны сыходзяць не назаўсёды, а толькі да наступнага года. Таму, калі ў чалавека з'явіліся такія сезонныя праявы, варта звярнуцца да алерголага для таго, каб пацвердзіць наяўнасць алергіі. Восенню, па-за сезонам цвіцення раслін, ставяцца скурныя пробы, і праз 20 хвілін можна вызначыць, на якія алергены так востра рэагуе арганізм. Калі дыягназ пацвярджаецца, трэба пачынаць лячэнне ўжо восенню, праводзіць спецыфічную імунатэрапію. У лячэнні выкарыстоўваюцца тыя алергены, што выклікаюць хваробу. Гэта тэрапія працягваецца да наступнага цвіцення. Лячэнне вельмі эфектыўнае і дазваляе спыніць хваробу. Праводзіць яго трэба пад назіраннем спецыяліста-алерголага і толькі ва ўмовах алергакабінета.

— Але што рабіць тым людзям, якія па нейкіх прычынах не змаглі загадзя падрыхтавацца да сезона цвіцення?

— За 10-14 дзён да чаканага перыяду абвастрэння хваробы неабходна пачынаць прымаць проціалергічныя, у прыватнасці, антыгістамінныя прэпараты. Гэта могуць быць эрыус, зіртэк, цэлфаст, кесцін, супрасцін, тавегіл, дыязалін і г.д. Яны дазволяць даволі паспяхова справіцца з сімптомамі хваробы.

Калі ж гэтых прэпаратаў будзе недастаткова, можна падключыць яшчэ прэпараты мясцовага дзеяння. У прыватнасці, калі маецца моцны рыніт, можна скарыстацца назанэксам, флюціказонам.

Рэкамендуецца таксама прытрымлівацца пэўных правілаў паводзін у штодзённым жыцці. Як і пры любой алергіі, вельмі важна максімальна зніжаць кантакт з алергенамі. Больш за ўсё пылку з'яўляецца ў цёплае надвор'е, ветранае, у першай палове дня. Таму людзям, у якіх ёсць палініоз, мы рэкамендуем у гэты час як мага менш знаходзіцца на свежым паветры, не выязджаць за горад, а калі выязджаць, то бліжэй да вадаёма і пад вечар. Такі пацыент павінен выходзіць на вуліцу ў сонцаахоўных акулярах. Вярнуўшыся дадому, неабходна здымаць адзенне, адразу ж прыняць душ. У кватэры пажадана зачыніць форткі, праводзіць частыя вільготныя прыборкі.

— Ці можа прыйсці на дапамогу народная медыцына?

— З гэтым трэба быць вельмі асцярожнымі. Такім пацыентам трэба ведаць, што ім супрацьпаказаны прыём розных раслінных прэпаратаў. Напрыклад, нельга прымаць у якасці лекаў прэпараты з палыну, рамонку, календулы, падбелу, дзівасілу, крываўніку, піжмы, трыпутніку. Гэта можа прывесці да абвастрэння палінозу і да прагрэсавання хваробы. Акрамя таго, вельмі важна ведаць, на што канкрэтна алергія і ў сувязі з гэтым прымаць пэўныя меры.

Ва ўмовах Беларусі адзначаецца тры пікі цвіцення раслін і тры перыяды ў цячэнні палінозу.

Першы — г.зв. драўняны палініоз, калі цвітуць дрэвы (канец красавіка — май). У нашых краях асноўнымі алергеннымі дрэвамі з'яўляюцца бяроза, арэшнік, ясень, нярэдка таполя. Гэты драўняны палініоз можа спалучацца з харчовай алергіяй. Інакш кажучы, калі ў чалавека ёсць алергія на пылок дрэў, то ўжыванне бярозавага соку, яблыкаў, груш, усіх костачкавых (чарэшні, вішні, персікі, абрыкосы, слівы) можа прыводзіць да абвастрэння хваробы. Акрамя таго гэтаму могуць спрыяць арэхі, асабліва фундук, грэцкія, міндаль. Негатыўныя рэакцыі можа выклікаць нават звычайная морква, а таксама сельдэрэй, кмен. Нельга лячыцца прэпаратамі з бярозавых пупышак, альховых шышак, кары крушыны.

Другі перыяд — цвіценне злакавых культур і пустазелля (жыта, цімафееўка, мятлік, купкоўка і інш.). Ёсць травы, якіх дастаткова не толькі ў сельскай мясцовасці, але і ў горадзе. Як правіла, яны цвітуць у пачатку чэрвеня і да сярэдзіны ліпеня. Зноў-такі і ў гэты перыяд можа мець месца харчовая алергія. Да абвастрэння палінозу можа прывесці ўжыванне такіх прадуктаў, як крупяныя кашы, макаронныя і хлебабулачныя вырабы, прадукты, у склад якіх уваходзіць мука.

Трэці перыяд пачынаецца з другой паловы ліпеня і працягваецца да верасня. У гэты час цвіце складанакветная пустазелле. І асноўнай алергеннай травой з'яўляецца палын. Зноў-такі цэлы шэраг прадуктаў могуць падтрымліваць праявы палінозу. У прыватнасці, гэта алей, халва, маянэз, гарчыца, прадукты, прыгатаваныя з выкарыстаннем палыну — вермуты, бальзамы. Сюды ж адносяцца сельдэрэй, кроп, пятрушка, перац, мускатны арэх, карыца, каляндра, могуць быць і морква, і бурак, і шпінат.

Вольга ШАЎКО.

А Ведзьма побач...

Жыхары Баранавічаў адвезлі свайго двухгадовага сына да родных у в. Каранеўшчына, што ў Ляхавіцкім раёне. Перад выхаднымі на мінулым тыдні дарослыя вырашылі закалоць свінню. Пакуль яны з жывёлінай валтузіліся, малое пайшло з падворка да ракі Ведзьма, якая працякае непадалёку. Неўзабаве дарослыя спахапіліся і кінуліся хлопчыка шукаць. Знайшлі дзіця ў рэчцы — яно ўтапілася. Глыбіня ў гэтым месцы дасягае паўтара метра.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

На колах

ЗРУХІ НА РЫНКУ НОВЫХ АЎТО

ІСНУЕ меркаванне, што пасля 1 ліпеня аўтамабіль у Беларусі стане прадметам раскошы, а не сродкам перасоўвання. Не сакрэт, што айчынны аўтарынак на сёння перанасычаны, і ў бліжэйшы час яго чакаюць вялікія змены. Многія перакананыя, што гэта будуць змены да горшага.

Мяркуецца, што беларускі рынак запоўніцца аўтамабілямі расійскай зборкі... Што выбар марак і мадэляў стане надзвычай вузкім, паколькі мадэльныя шэрагі будуць абмежаваны маркетынгавай палітыкай кампаній, якія пастаўляюць аўтамабілі на наш рынак... Моцна вырастуць цэны, — як у сувязі з павышэннем мытных ставак, так і ў адказ на натуральны рост попыту.

Нармальнаму развіццю аўтарынку ў Беларусі перашкаджае, на думку аўтадылераў, нямала прычын — як эканамічных, так і адміністрацыйных.

Тым не менш, на прэс-канферэнцыі, прысвечанай аб'яўленню стратэгіі на 2011 год брэнда «Chevrolet», генеральны дырэктар СААТ «Мінск-Лада», афіцыйнага дылера Chevrolet у Беларусі Аляксандр СТЭЛЬМАХ заўважыў, што зараз якраз той момант у аўтагісторыі краіны, калі можна заваяваць давер аўтааматараў.

— У перспектыве Мытны саюз будзе працаваць не толькі на макраэканамічныя паказчыкі, але прынясе карысць і звычайным грамадзянам краіны, — заўважыў Аляксандр Іванавіч. — Пакуль жа мы плануем прадаставіць выбар, прымальныя цэны і якасны стыльны прадукт у абмен на веру беларусаў у перспектыву развіцця салонаў новых аўто. Сёлета кампанія Chevrolet плануе прадставіць сусветнаму рынку 11 новых мадэляў аўтамабіляў, 7 з якіх будуць арыентаваныя на еўрапейскі рынак, а 5 з іх будуць прадстаўлены на рынку Беларусі.

Вытворчасць Chevrolet ёсць не толькі ў Паўднёвай Карэі, але і ва Украіне і Расіі. Пастаўкі з Расіі нявыгадныя, таму ўсе аўтамабілі, прадстаўленыя ў нашым аўтасалоне, выраблены і завезены выключна з Паўднёвай Карэі. На 81-м аўтасалоне ў Жэневе былі выстаўлены 7 з 11 мадэляў Chevrolet. Асаблівую цікавасць выклікаў аўтамабіль Chevrolet Volt, здольны выпрацоўваць уласную энергію, якой хапае на больш як 500 км.

Мы будзем імкнуцца да таго, каб захаваць цэны на аўтамабілі на ўзроўні мінулага года. У захаванні цаны зацікаўленыя і пастаўшчыкі. Першай навінкай, якую мы прадстаўляем на тутэйшым рынку ў гэтым годзе, становіцца Chevrolet Orlando — сямімесны аўтамабіль накшталт красовера, прывабная функцыянальнасць па даступным кошце. Другі і трэці рады сядзенняў трансфармуюцца ў аб'ёмны багажнік. Аўтамабіль выраблены з трывалай сталі. У ім 6 падушак бяспекі, аўтаматычная або механічная трансмісія. Гэта першы паўднёвакарэйскі аўтамабіль з дызельным рухавіком аб'ёмам 2.0 л.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Организация:

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «АБРАЗИВХИМСБЫТ»

Учетный номер плательщика: **УНП 191046462**
Единица измерения: **млн руб.**
Адрес: **220123, г. Минск, ул. Кропоткина, 110-101**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 01 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
ИТОГО по разделу I	**190**	**57**	**101**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	768	1 510
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	7	156
ИТОГО по разделу II	**290**	**942**	**1 795**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**999**	**1 896**
ПАССИВ	**Код строки**	**На начало года**	**На конец отчетного периода**
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	21	21
Резервный фонд	420	-	1
Добавочный фонд	430	13	79
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	42	132
ИТОГО по разделу III	**490**	**76**	**233**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	116	359
Кредиторская задолженность	620	807	1 304
ИТОГО по разделу V	**690**	**923**	**1 663**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**999**	**1 896**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-050-060)	**070**	**197**	**96**
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	16	4
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	-	-
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	16	4
Внереализационные расходы	150	25	26
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-9	-22
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (±070±120±160)	**200**	**185**	**74**
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210		-
Доходы, не учитываемые при налогообложении	**220**	**-**	**-**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (±200+210-220)	**240**	**185**	**74**
Налог на прибыль	250	27	14
Прочие налоги, сборы из прибыли	**260**	**3**	**2**
Прочие расходы и платежи из прибыли	**270**	**65**	**16**
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**90**	**42**
Справочно (из строки 300): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль	310	64	13
Прибыль (убыток) на акцию	320	-	-
Количество прибыльных организаций / сумма прибыли	330	1 / 90	1 / 42
Количество убыточных организаций / сумма убытка	340	0 / 0	0 / 0

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ ЗА 2010 ГОД

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО «ДОРОЖНО-СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ № 4 г. БРЕСТ»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

млн руб.

Наименование показателя	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
АКТИВ			
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства, первоначальная стоимость	101	107628	125493
амортизация	102	64007	74345
остаточная стоимость	110	43621	51148
Нематериальные активы, первоначальная стоимость	111	205	179
амортизация	112	74	86
остаточная стоимость	120	131	93
Доходные вложения в материальные ценности, первоначальная стоимость	121		1124
амортизация	122		335
остаточная стоимость	130		789
Вложения во внеоборотные активы	140	626	1038
ИТОГО по разделу I	190	44378	53068
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	9696	13970
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	555	542
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	9710	11066
Денежные средства	260	124	181
Финансовые вложения	270	15	26
Прочие оборотные активы	280	9	50
ИТОГО по разделу II	290	20109	25835
БАЛАНС	**300**	**64487**	**78903**
ПАССИВ			
III. КАПИТАЛЫ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	2259	2259
Резервный фонд	420	859	873
Добавочный фонд	430	47029	54246
Нераспределенная прибыль	450	6104	6077
ИТОГО по разделу III	490	56251	63455
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		996
ИТОГО по разделу IV	590	0	996
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	640	3490
Кредиторская задолженность	620	7595	10962
Задолженность перед участниками	630	1	
ИТОГО по разделу V	690	8236	14452
БАЛАНС	**700**	**64487**	**78903**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ с 1 января по 31 декабря 2010 г.

млн руб.

Наименование показателей	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	99149	99278
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	16201	15331
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) (010-011)	020	82948	83947
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	80164	81162
Валовая прибыль (02-021-030)	040	2784	2785
Прибыль (убыток) от реализации	070	2784	2785
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	2321	4437
Налоги, включаемые в операционные доходы	081	304	614
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) (080-081)	090	2017	3823
Операционные расходы	100	1654	3521
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов (090-100)	120	363	302
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	1071	964
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	7	13
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) (130-131)	140	1064	951
Внереализационные расходы	150	2211	1761
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150)	160	-1147	-810
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (070+/-120+/-160)	200	2000	2277
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	2132	1656
Доходы, не учитываемые при налогообложении	220	379	153
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения (200+210-220)	240	3753	3780
Налог на прибыль	250	835	790
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	419	436
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	351	12
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	300	395	1039

Пункты 5-10 формы 1 «Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности»

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	2729	2348
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
в том числе: физических лиц	лиц	2728	2347
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	млн. руб.	91	166
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	5,63	10,29
Обеспеченность акции имуществом общества	тыс. руб.	3,39	2,97
Среднесписочная численность работающих	человек	734	780

10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **Строительство и реконструкция автомобильных дорог – 31018 млн. руб. (31,3 %).**

Заместитель генерального директора по экономическим вопросам **Т.П. Пинюта**

Главный бухгалтер **Н.С. Чайковская**

УНП 200274482.

ГЛХУ «Червенский лесхоз» постоянно производит и реализует пиломатериалы обрезные и необрезные хвойных пород, лесоматериалы диаметром от 18 см и выше хвойных и лиственных пород.

Обращаться по адресу: г. Червень, ул. Барыкина, 16, тел.: 8 029 148 47 02 — главный инженер, 8 01714 55 904 — цех.

УНП 600004086

ВНИМАНИЮ КРЕДИТОРОВ ООО «БелСтройЭстейт»

ООО «БелСтройЭстейт» сообщает об уменьшении своего уставного фонда.

За дополнительной информацией и для предъявления требований о досрочном погашении обязательств обращаться по адресу: **г. Минск, ул. Орловская, 58, оф. 211 и по телефону: (017) 335 04 79**.

УНП 191439089

Проектная декларация Объекта долевого строительства

Заказчик-Застройщик – ОАО «Минскпромстрой».
Зарегистрировано Минским горисполкомом решение № 698 от 20 июня 2000 года в едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100064639.
Лицензия № 02250/0627487, выдана Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь и действительна до 15 марта 2014 года.
Адрес: 220034, г. Минск, пер. Войсковой, 12.
Режим работы: понедельник – четверг 900 – 19.00 (обед 13.00 – 14.00), пятница 9.00 – 18.00 (обед 13.00 – 14.00), суббота 900 – 13.00, выходной – воскресенье.
Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет ОАО «Минскпромстрой» построены и введены в эксплуатацию объекты:
- жилой дом № 8 по ул. Тимошенко;
- жилые дома №№ 16, 20 по ул. Бурдейного;
- жилые дома №№ 89, 91, 73, 75 по ул. Притыцкого;
- жилой дом № 36 по ул.Чечота.

Цель проекта – Строительство объекта «Многоэтажный жилой дом № 35 (по генплану), в микрорайоне «Дружба-1» по пр. Дзержинского» общей площадью 46 046,88 кв.м, в том числе общая площадь квартир – 39 238,74 кв.м.
Строительство осуществляется за счет средств физических и юридических лиц.
Начало строительства объекта – IV квартал 2009 года.
Окончание строительства секции №№ 10-11 – декабрь 2011г., секции №№ 12-13 – март 2012 г.
Месторасположение объекта – Московский район г. Минска, микрорайон «Дружба-1», вблизи проектируемой станции метро, через пр. Дзержинского гипермаркет «Простор».
Жилой дом запроектирован: 6-7-8-9-14 этажей, 13 подъездов, 16 лифтов, всего квартир – 487, из них: 1-комнатных – 65 шт., 2-комнатных – 195 шт., трехкомнатных – 219 шт., четырехкомнатных – 8 шт. На первом этаже – служебное помещение Товарищества собственников.
Гостевые парковки предусматриваются вдоль проезда и на дворовой территории. Парковочные места автотранспорта планируются в коммунальной зоне микрорайона. Благоустройство внутридворовой территории предусматривает игровое оборудование для детей, пешеходные дорожки, озеленение.
В состав общего имущества объекта входят: лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, кровля, технические и подвальные этажи, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механические, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры (в т.ч. внеплощадочные объекты инженерно-транспортного обеспечения дома), озеленения и благоустройства, помещение Товарищества собственников, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.
Конструкция здания – монолитный железобетонный каркас с плоскими монолитными перекрытиями с переменной сеткой колонн. Наружные стены – кирпич поризованный с утеплением. Окна (за исключением лоджий) – ПВХ профиль с двухкамерным стеклопакетом.
Проектно-сметная документация прошла в установленном порядке государственную экспертизу от 11.02.2009 г. №329-5/09. Получены положительные заключения КАиГ 08.10.2008 г. № 10-08/146М, Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды от 21.10.2008 г. № 02-6/2184.
Получено разрешение Госстройнадзора № 2-203Ж-046/09 от 17.09.2009 г. на производство строительно-монтажных работ.
Участок площадью 4,1008 га передан ОАО «Минскпромстрой» на основании решения Мингорисполкома № 1107 (п. 10) от 21.05.2009 года для строительства объекта. Свидетельство о государственной регистрации земельного участка и возникновения права на него от 02.07.2009 г. № 500/1054-856.
Заключение договоров создания Объекта долевого строительства проводится по неизменной, на период действия договора, цене для всех категорий граждан. На дату опубликования декларации и по 29 апреля 2011 г. к долевому строительству предлагаются 46 квартир общей площадью 3,9 тыс.м², расположенных с 1-го по 9-й этаж, из них:
— для юридических лиц и физических лиц не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий предлагаются все 46 квартир общей площадью 3,9 тыс. м², расположенных с 1-го по 9-й этаж, а именно: однокомнатные квартиры 51,05 м² по цене 4,2 млн руб. за 1(один) кв.м.общей площади; двухкомнатные квартиры общей площадью 63,06; 63,28 и 68,69 м² по цене 4,2 млн руб. за 1(один) кв.м общей площади; трехкомнатные квартиры общей площадью 77,23; 87,08; 87,29; 87,82; 89,58; 92,78; 96,3; 96,8; 96,88; 98,05; 98,06; 99,49 и 105,21 м² по цене 3,8 млн руб. за 1(один) кв.м общей площади и четырехкомнатная квартира общей площадью 114,42 м² по цене 3,8 млн руб. за 1(один) кв.м общей площади;
— для физических лиц, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий из указанных 46 квартир предлагаются 18 квартир общей площадью 1,7 тыс. м², расположенных на 1, 6, 7, 8 и 9 этажах, а именно: трехкомнатные квартиры общей площадью 87,08; 87,29; 87,82; 89,58; 92,78; 96,3; 96,8; 96,88; 98,06; 99,49 и 105,21м² и четырехкомнатная квартира общей площадью 114,42м² по цене 3 492 000 руб. за 1(один) кв.м общей площади.
Заказчиком-застройщиком по строительству объекта выступает ОАО «Минскпромстрой». Функции генерального подрядчика исполняют филиалы ОАО «Минскпромстрой», выполняя при этом часть работ самостоятельно, а часть по субподрядным договорам со специализированными сторонними организациями.
Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по строительству жилого дома можно получить по адресу: г. Минск, пер. Войсковой, 12, каб. 312 или по телефонам 283 15 88; 283 15 78; Velcom (044) 787 12 68.

Генеральный директор В.С. Нехай

ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ за 2010 г.

ОАО «БРЕСТСКИЙ РАДИОТЕХНИЧЕСКИЙ ЗАВОД»

224023, г. Брест, ул. Московская, 248, тел.: (0162) 41 09 84, факс (0162) 42 51 59

Основные виды деятельности:
производство электронно-вычислительных машин и другого оборудования для обработки информации

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г. (млн руб.)

АКТИВ	Код стр.	На начало отчетного года	На конец отчетного периода
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	2324	2795
Нематериальные активы	120		47
Доходные вложения в материальные ценности	130		
Вложения во внеоборотные активы	140	7	1
Прочие внеоборотные активы	150		
ИТОГО по разделу I	**190**	**2331**	**2843**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	1551	1484
Налоги по приобретенным активам	220	6	
Дебиторская задолженность	240	770	639
Расчеты с учредителями	250		
Денежные средства	260	65	303
Финансовые вложения	270	2	2
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**2394**	**2428**
БАЛАНС	**300**	**4725**	**5271**
ПАССИВ	**Код стр.**	**На начало отчетного года**	**На конец отчетного периода**
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	410	2375	2375
Резервный фонд	420	187	277
Добавочный фонд	430	1140	1559
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	450	277	288
Целевое финансирование	460		
ИТОГО по разделу III	**490**	**3979**	**4499**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510		
Прочие долгосрочные обязательства	520	23	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**23**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	90	-
Кредиторская задолженность	620	615	757
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	18	15
ИТОГО по разделу V	**690**	**723**	**772**
БАЛАНС	**700**	**4725**	**5271**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за 2010 г. млн руб.

Наименование показателей	Код стр.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	10290	6820
Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	1522	955
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	8768	5865
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	7495	4779
Управленческие расходы	050	1051	874
Расходы на реализацию	060	143	87
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг	070	79	125
II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Операционные доходы	080	1694	1463
Налоги, включаемые в операционные доходы	081	125	126
Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы)	090	1569	1337
Операционные расходы	100	1271	956
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	298	381
III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	65	18
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	5	1
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	60	17
Внереализационные расходы	150	178	140
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	160	-118	-123
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	200	259	383
Расходы, не учитываемые при налогообложении	210	168	136
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) до налогообложения	240	427	519
Налоги на прибыль	250	98	115
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	45	51
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	1	1
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	300	115	216

Обеспеченность акции имуществом общества – 11365 руб.

Количество акционеров всего – 972, в том числе юридических лиц – 1, физических лиц – 971.

Среднесписочная численность работающих – 160 чел.

Собрание акционеров проведено – 17 марта 2011 г.

Установлен размер дивидендов по итогам работы за 2010 год на одну акцию в сумме 36,308 рублей.

Порядок выплаты дивидендов:

- акционерам-работникам общества, – в кассе общества или путем перечисления на вкладные счета;
- сторонним акционерам – физическим лицам – почтовым переводом или путем перечисления на вкладные счета;
- юридическим лицам – путем перечисления на расчетный счет.

Дивиденды на принадлежащие Республике Беларусь акции перечислить в республиканский бюджет не позднее 1 мая 2011 года.

Директор **Г.А. Ковалевич**

Главный бухгалтер **И.В. Ярмак**

УНП 200273907.

ОАО «УкрБелСтройСнаб»

г. Минск, ул. Тимирязева, 65 Б

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 01.01.2011 г.

млн руб.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	37	68
амортизация	102		6
остаточная стоимость	110	37	62
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111		1
амортизация	112		1
остаточная стоимость	120		
ИТОГО по разделу I	**190**	**37**	**62**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	582	642
В том числе:			
сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	326	99
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	11	4
товары отгруженные	216	175	509
расходы будущих периодов	218	69	30
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	92	14
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230		
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	72	763
В том числе:			
покупателей и заказчиков	241		479
поставщиков и подрядчиков	242	72	260
по налогам и сборам	243		24
Расчеты с учредителями	250	58	
по вкладам в уставный фонд	251	58	
Денежные средства	260	127	599

Глыбінка

«ДРОЎ ХОПІЦЬ НА ДЗВЕ ЗІМЫ»

Жыхарцы вёскі Акунінава Слонімскага раёна Ганне Антонаўне Рубец 88 гадоў. Пражыта нямала, хоць жыццёвы лёс вясковую жанчыну не вельмі песціў.

Падчас Другой сусветнай вайны маладую Ганну Рубец забралі ў Германію, а мужа на фронт. 1 год і 7 месяцаў дзяўчына адпрацавала там на разборцы дамоў. З палону вызвалілі савецкія войскі. Прыехала на Радзіму. Чакала з вайны свайго мужа Ціхана, але так і не дачакалася. З ваенкамата прынеслі паперку, у якой паведамлялася, што муж прапаў без вестак.

Выйшла замуж другі раз. Нарадзіла трох дачок і трох сыноў.

Пра ўсё гэта нам расказала Ганна Антонаўна на сваім падворку, калі разам з дачкою Валянцінай складвала паколатыя дровы. Валянціна на пэўны час завітала дамоў да маці. Жыве яна ва Украіне, у Днепрапятроўскай вобласці. «У вас тут, у Беларусі, лепш жывецца, чым нам ва Украіне», — сказала Валянціна Іванаўна.

— Чаму лепш? — пытаемся.

— Таму што лепш. У Беларусі ёсць праца, своечасова даюць заробак, працуе медыцына. А ў нас там з гэтым і з іншым — больш праблем, — уздыхнула слонімская ўкраінка.

Пакуль жанчыны складвалі дровы, мы ад вясковых кабет даведаліся, што дровы яны купілі за 500 тысяч рублёў, а за 40 тысяч нанялі чалавека, які іх пакалоў.

— Цяпер мне дроў хопіць на дзве зімы, — радасна ўздыхнула пенсіянерка Ганна Рубец.

Сяргей ЧЫГРЫН. Фота аўтара.

КУЛЬТУРА ЯК АПАГЕЙ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Міністры культуры Беларусі і Украіны на брыфінгу ў тэатры оперы і балета ў Мінску адзначылі асаблівасці развіцця стасункаў краін-суседак у галіне культуры і мастацтва.

— Нам вельмі прыемна, што Дні культуры Украіны праводзяцца ў Беларусі, — гаворыць **міністр культуры Беларусі Павел ЛАТУШКА**. — Гэтая акцыя адбываецца ў адказ. Вы ведаеце, што ў верасні мінулага года ў Кіеве і Львове адбыліся Дні культуры Беларусі ва Украіне. Гісторыя ўзаемных Дзён культуры Беларусі і Украіны пачынаецца з 1957 года. За часы незалежнасці гэта ўжо шостая падобная акцыя. Тры разы Беларусь прадстаўляла сваю культуру ва Украіне, і тры разы Украіна была госцем Беларусі. Дзякуючы падпісанай летась праграме супрацоўніцтва ў галіне культуры паміж міністэрствамі культуры Беларусі і Украіны, апошнім часам мы назіраем актывізацыю нашых адносін. Напярэдадні сёлетніх Дзён культуры Украіны ў Беларусі мы паспрабавалі палічыць: а колькі ж культурных мерапрыемстваў з удзелам нашых сяброў з Украіны адбылося ў Беларусі? З 2008 года на тэрыторыі нашай краіны мы налічылі больш за 150 разнастайных культурных мерапрыемстваў: фестываляў, акцый, выставак, канцэртаў, у якіх бралі ўдзел прадстаўнікі мастацтва Украіны. Дні культуры фактычна з'яўляюцца алімпам, апагеем супрацоўніцтва, якое адбываецца штодня паміж Беларуссю і Украінай у галіне культуры і мастацтва.

Разам з маім калегам, міністрам культуры Украіны Міхаілам Кулынякам, мы абмеркавалі перспектывы далейшага супрацоўніцтва: падчас правядзення разнастайных знакавых фестываляў у нас, такіх як «Славянскі базар», кінафестываль «Лістапад»; гаварылі пра неабходнасць новага імпульсу супрацоўніцтва паміж ВНУ культуры і мастацтва Беларусі і Украіны; магчымасці рэалізацыі сумесных праектаў у галіне кіно; абмяркоўвалі перспектывы адкрыцця помніка Уладзіміру Караткевічу ў Кіеве. Дарэчы, спадзяёмся, што помнік будзе ўсталяваны сёлета ў першай дэкадзе красавіка, і ў бліжэйшы час адбудзецца яго афіцыйнае адкрыццё. Мы абмяркоўвалі перспектывы стварэння культурнага цэнтра Беларусі ў Кіеве і шмат-шмат іншых праектаў.

— Вельмі хутка мы пабачым беларускія пастаноўкі (спектаклі, оперы) ва Украіне і ўкраінскія ў Беларусі, — перакананы **міністр культуры Украіны Міхаіл КУЛЫНЯКА**. — Ужо, напрыклад, падпісана пагадненне паміж беларускім тэатрам оперы і балета і Львоўскім оперным тэатрам.

Міністр культуры Украіны адзначыў, што сёлета яго радзіма адзначае 20 гадоў незалежнасці, і запрасіў афіцыйную беларускую дэлегацыю і наогул усіх беларусаў далучацца да святкавання.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

На радыяцыйным фоне

Пра страх, ёд і чыстыя прадукты

УСУВЯЗІ з трагедыяй на японскай АЭС «Фукусіма-1» насельніцтва шэрагу краін усё ж такі паддалося лёгкай паніцы, аб чым, паводле інфармацыі інтэрнэт-выданняў, сведчыць актыўнае набыццё чырвонага віна і прэпаратаў з утрыманнем ёду. Вось што думаюць пра радыяцыйную фобію беларускія спецыялісты.

Ірына БАЙКОВА, загадчык кафедры псіхатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны пазаштатны псіхатэрапеўт Міністэрства аховы здароўя Беларусі:

— З пункту гледжання псіхалогіі няправільна засяроджваць увагу на фобіях. Так яны толькі разрастаюцца, узмацняюцца і яшчэ больш укараняюцца ў свядомасці людзей. Фабійныя рэакцыі, дарэчы, як правіла, не залежаць ад таго, наколькі рэальна небяспечным з'яўляецца раздражняльны фактар. Ратуе ад страхаў, галоўным чынам, адно: добрая інфармаванасць адносна аб'екта, здольнага нарадзіць фобію. Маюць значэнне і асаблівасці асобы: людзі не самастойныя, бездапаможныя, залежныя ад пэўных абставін больш схільныя да фабійнага рэагавання, але на гэты аспект паўплываць значна складаней.

Вельмі важна аб'ектыўна асвятляць рэальныя магчымасці таго ж радыяцыйнага заражэння, і тады мы будзем ведаць і ўсведамляць, што з-за праблем на «Фукусіме-1» у Беларусі не можа павялічыцца радыяцыйны фон. З гэтага вынікае, што не варта скупляць ні чырвонае віно, ні прэпараты ёду. Тым больш што апошнія можна прымаць толькі па рэкамендацыі ўрача-эндакрынолага. Урач павінен спачатку ўстанавіць факт дэфіцыту гэтага мікраэлементу ў канкрэтнага пацыента. У процілеглым выпадку мы атрымаем пабочныя сімптомы, якія пагоршаць наша здароўе.

Сяргей КАРЫЦЬКА, галоўны ўрач Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння:

— Мы надта далёка ад Японіі, і можна з усёй упэўненасцю сказаць, што можам спаць спакойна. Яшчэ і таму, што пасля аварыі на ЧАЭС на тэрыторыі нашай краіны і краін-суседзяў наладжаны добры радыяцыйны кантроль. Любыя адхіленні не застануцца незаўважанымі і замоўчанымі... Неабходна разумець, што сёння не існуе ніводнага цалкам бяшкоднага віду энергетыкі. Я думаю, як і ў любой іншай важнай справе, неабходна, з аднаго боку, давяраць вучоным, а з другога — вытрымліваць належныя правілы бяспекі.

Якаў КЕНІГСБЕРГ, прафесар, загадчык лабараторыі радыяцыйнай бяспекі Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра гігіены, старшыня Нацыянальнай камісіі па радыяцыйнай абароне пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь:

— Я адмоўна стаўлюся да слова «фобія», паколькі не схільны прыпісваць людзям дыягназы з галіны псіхіятрыі. Людзі не павінны лічыць сябе хворымі. Іншая рэч, тое, што нашы людзі баяцца радыяцыі. Страх — абсалютна нармальная рэакцыя. Так і павінна быць, паколькі за савецкім часам нас выхоўвалі на занятках па грамадзянскай абароне ў атмасферы гатоўнасці да атамных выбухаў і ядзернай вайны. Людзі баяцца радыяцыі яшчэ і таму, што, у адрозненне ад шэрагу іншых шкодных фактараў, яе немагчыма адчуць. Аварыя ж на ЧАЭС толькі ўзмацніла страх перад радыяцыяй...

Пытанне ўжывання чырвонага віна і прэпаратаў ёду, як сродкаў абароны ад радыяцыйнага забруджвання, — тэма старая, як свет. І тым не менш можна яшчэ раз паўтарыць, што ніякі алкаголь не спрыяе абароне ад радыяцыі. У алкаголю ёсць толькі адно, так бы мовіць, пабочнае, ускоснае дзеянне, якое хоць нейкім чынам звязана з тэмай нашай размовы. Калі чалавек выпівае пэўную колькасць спіртнога, то непазбежна ў яго ўзнікае стан, пры якім арганізму патрабуецца павялічаная колькасць вадкасці. А калі чалавек п'е многа вады, чаю, соку, то ў яго ўзмацняецца мочааддзяленне. А такія водарастваральныя радыенукліды, як цэзій, выводзяцца з мачой...

Што датычыцца стандартнай панікі, якая ўзнікае ў нас штогод напярэдадні 26 красавіка і праяўляецца жаданнем скупіць у аптэцы больш вітамінных прэпаратаў, то такая практыка ў лепшым выпадку бессэнсоўная. Сапраўды, існуюць спецыяльныя таблеткі з вельмі вялікімі дозамі ёду. Іх неабходна прымаць, калі ўзровень небяспечнага ёду ў паветры або харчовай прадукцыі дасягнуў небяспечных велічынь. Такія прэпараты патрэбны для таго, каб заблакіраваць шчытападобную залозу стабільным ёдам і не даць асесці ў ёй ёду радыеактыўнаму. Але для дасягнення такога эфекту неабходна прыняць пэўную колькасць міліграмаў ёду, а прэпараты, якія прадаюцца ў аптэках, утрымліваюць мікраграмы гэтага рэчыва, а значыць, не здольныя забяспечыць патрэбны эфект. Не забяспечваюць абароны ад радыенуклідаў і пекцыны — рэчывы, якія ўтрымліваюцца ў яблыках, бураках, вінаградзе, іншых прадуктах раслінага паходжання. Пекцыны здольныя звязваць і выводзіць з арганізма выключна цяжкія металы.

Разам з тым, сапраўды, існуе спецыяльны прэпарат, які выкарыстоўваецца для абароны работнікаў атамных электрастанцый ў тых выпадках, калі яны могуць атрымаць або атрымалі павышаную дозу радыяцыі. Выводзіць радыенукледы з арганізма здольнае рэчыва, сінтэзаванае ў свой час адным нямецкім вучоным, а потым і савецкімі вучонымі. Гэта берлінскі лазурак, прызваны так за свой насычаны сіні колер. Прэпарат вядомы сваёй уласцівасцю звязваць цэзій. Прызначаецца выключна для прафесіяналаў, якія працуюць ва ўмовах павышанай радыяцыі. Берлінскі лазурак прымяняўся ў Беларусі менавіта з такой мэтай пасля аварыі на ЧАЭС. Насельніцтва ж абараняюцца іншымі спосабамі. Перш за ўсё размова ідзе пра абмежаванне дозы абпраменьвання без выкарыстання лекавых прэпаратаў, што прымянялася адразу пасля аварыі на ЧАЭС і прымяняецца дагэтуль: спыняюцца шляхі трапляння радыенуклідаў у арганізм чалавека з забруджанымі прадуктамі харчавання. Таму берлінскі лазурак пачалі дадаваць у корм жывёле, што паспяхова прымяняецца не толькі ў Беларусі, але ў Расіі і ва Украіне.

Паколькі з-за аварыі на «Фукусіме-1» пэўная колькасць радыяцыі трапіла ў атмасферу і мясцовую прадукцыю — малако, зялёную цыбулю і шпінат, у якіх выяўлена павышанае ўтрыманне цэзію, была ўведзена забарона на ўжыванне гэтых прадуктаў. Што да радыеактыўнага воблака, то вецер пасля аварыі дзьмуў у бок Ціхага акіяна, а ў Злучаных Штатах пастаянна праводзяцца вымярэнні. Беларусь жа знаходзіцца ў зоне абсалютнай бяспекі. У нас пастаянна вымяраюць радыяцыю 52 пункты замеру радыяцыйнага фону. Увесь апошні час лічбы застаюцца пастаяннымі.

Адносна будаўніцтва АЭС на тэрыторыі нашай краіны можна сказаць, што кожны мае права на свой пункт гледжання. Я асабіста заўсёды быў «за», і вельмі шкадую, што ў 1986 годзе было прыпынена будаўніцтва АЭС у раёне Рудзенска, — мы б даўно мелі добрую АЭС, якая забяспечвала нас электраэнергіяй.

Уладзімір БАБЕНКА, намеснік дырэктара ПУП «Інстытут радыяцыйнай бяспекі «Белрад»:

— У нашым выпадку пагрозы для здароўя насельніцтва Беларусі не існуе. Аднак калі раптам нешта падобнае здарылася б значна бліжэй да нас, то насельніцтва павінна было б загадзя, абласнога ўзроўню, а таксама, напрыклад, у нашым інстытуце, Інстытуце радыялогіі ў Гомелі, яго філіяле ў Пінску. Набыць такую прыладу для ўласнага выкарыстання наўрад ці выпадае, паколькі яна не толькі дорага каштуе, але і важыць каля 170 кг. Нарэшце, варта імкнуцца не трапляць пад дождж ці снег, бо ападкі вымываюць радыеактыўныя рэчывы з паветра.

У нашым інстытуце можна прайсці даследаванне на спектрометры, які вызначае наяўнасць і колькасць радыеактыўных рэчываў у арганізме чалавека. Калі факт наяўнасці радыенуклідаў пацверджаны, то для іх вывядзення можна прапіць «Вітапект-Т» — таблетаваны энтэрасарбент, або растваральны, сухі, яблычны напой. Эфект вывядзення радыенуклідаў з арганізма даказаны нашымі вучонымі яшчэ дзесяць гадоў назад і пацверджаны незалежнымі даследаваннямі вучоных Украіны.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ГРОШЫ — З ПАВЕТРА

налічвала сабе бухгалтар псіханеўралагічнага інтэрната ў Івацэвіцкім раёне. Як высветліла следства, жанчына на працягу двух гадоў запаўняла фіктыўныя табелі ўліку рабочага часу, а за лішнія гадзіны грошы налічвала сабе. Такім чынам яна прысвоіла каля 12,5 мільёна рублёў. Зараз службовая асоба знаходзіцца пад падпіскай аб нявыездзе. Палову грошай яна ўжо вярнула ў касу.

Яна СВЕТАВА.

МАНЕТЫ, ПРЫСВЕЧАНЫЯ ЎСІМ ЗНАКАМ ЗАДЫЯКА

Нацыянальны банк Беларусі з сённяшняга дня ўводзіць у абарачэнне шэраг памятных манет: залатыя — «Авен», «Цялец», «Блізняты», «Рак», «Леў», «Дзева», «Шалі», «Скарпіён», «Стралец», «Казярог», «Вадалей», «Рыбы» серыі «Знакі задыяка» і срэбраную і медна-нікелевую «Катти Сарк (Cutty Sark)» серыі «Парусные корабли».

Як паведаміў карэспандэнту нашай газеты намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл Журавовіч, памятныя манеты серыі «Знакі задыяка» маюць намінал 100 рублёў, пробу сплаву 900, масу 15,5 г, дыяметр 30,0 мм. Адчаканеныя яны на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «пруф», тыражом — да 2000 штук кожнага наймення.

Сярэбраная памятная манета «Катти Сарк (Cutty Sark)» серыі «Парусные корабли» выпушчаная наміналам 20 рублёў, пробай сплаву 925, масай 28,28 г, дыяметрам 38,61 мм, медна-нікелевая — наміналам 1 рубель. На сярэбранай манеце ў цэнтры на фоне навігацыйнай марской карты — стылізаваная выява ружы вятроў з нанесенай галаграмай. Гэтыя манеты адчаканеныя на АТ «Манетны двор Польшчы» якасцю «брыльянт — анцыркулейтэд». Тыраж сярэбранай манеты — да 7000 штук, медна-нікелевай — 3000 штук.

Ігар ГРЫШЫН.

На скрыжаванні думак

49 СТУДЭНТАЎ ПАТРАБУЮЦЬ НЕ ЗВАЛЬНЯЦЬ ЛЮБІМАГА ВЫКЛАДЧЫКА

Надзея Лаўрухіна адпрацавала ва Універсітэце культуры 32 гады. Пазіцыя ўніверсітэта: «Мы ўсё робім паводле закона»

Такое здараецца рэдка — калі людзі не баяцца пад сваім іменем змагацца за правы іншага чалавека. А тут — у «Звязду» звярнуліся 49 (!) студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усе падпісаліся сваімі імёнамі, усе паўтарылі свае словы на дыктафон, згадзіліся сфатаграфавацца. Выкладчыкі — таксама не баяцца ўголас заступіцца за калегу. Выпускнікі выказваюць абурэнне. Дык што здарылася ў адным з самых творчых ВНУ краіны?

Надзея ЛАЎРУХІНА, звольненая выкладчыца:

«Пасля 32 гадоў працы бегаць выкладаць пагадзінна — знявага для мяне...»

Надзеі Міхайлаўне Лаўрухінай 63 гады. Яна — слаўуты, заслужаны чалавек. Без перабольшвання, у кожным харэаграфічным каледжы краіны сёння выкладаюць яе выпускнікі. Аднак, прызнацца шчыра, як недасведчаны ў справе харэаграфіі журналіст, я грэшным чынам думаў сабе: ці можа чалавек у такім узросце выкладаць танец? Каюся. Калі я фатаграфаваў Надзею Міхайлаўну ў балетнай зале, склалася адчуванне, што яна дасць фору любой 20-гадовай студэнтцы!.. То бок, пытанне пра тое, ці «прафпрыдатная» яна, адпала з першага погляду. Надзея Міхайлаўна працуе ва Універсітэце культуры ўжо 32 гады. І вось ёй на рукі выдаюць «Паведамленне аб звальненні», дзе гаворыцца, што «ў сувязі са сканчэннем тэрміну кантракта 29.03.2011 яна будзе звольненая»...

— Надзея Міхайлаўна, як вы даведаліся, што вас звальняюць?

— 22 лютага мяне выклікала да сябе загадчыца кафедры харэаграфіі Святлана Гуткоўская. Замкнула дзверы кабінета на ключ і сказала, што «ёй надакучыў ценявы лідар» і яна, карыстаючыся тым, што скончаецца кантракт, мяне звальняе. Сказала, што ўжо ўсё дамоўлена. Назаўтра я сапраўды атрымала паведамленне аб звальненні. Я была ў шоку! Паўтара месяца таму ціснулі мне руку, калі ўручалі грамату! Месяц таму мяне прызналі «Найлепшым выкладчыкам года» кафедры харэаграфіі па выніках 2010 года. І раптам — звальненне...

— У чым прычына вашага канфлікту з загадчыцай кафедры?

— Я ніколі не хаваю свае думкі, усё кажу наўпрост — уголас, на пасяджэннях кафедры. А ёй, відаць, хочацца, каб яе толькі хвалілі. Я не хачу сказаць, што наш канфлікт раптоўны. Непаразуменні былі і раней. Святлана Гуткоўская працуе на гэтай пасадзе ўжо 15 гадоў.. Дарэчы, перад гэтым абавязкі загадчыка кафедры выконвала я — і менавіта я парэкамендавала яе на гэтую пасаду, бо не хацела займацца адміністрацыйнай працай, хацела займацца выкладаннем, творчасцю.

— Вашае кіраўніцтва завуалявана кажа, што яны проста адпраўляюць пенсіянера на заслужаны адпачынак. А чаму ж пенсіянер супраціўляецца?

— Ведаеце, калі б на кафедру прыходзілі новыя, маладыя выкладчыкі — ніякай гаворкі б не было. Аднак за апошнія некалькі гадоў на кафедру прынятыя чатыры чалавекі перадпенсійнага веку! Дык, даруйце, чым яны каштоўнейшыя за мяне, якая адпрацавала тут 32 гады!? Я сама неаднойчы казала, што хачу падрыхтаваць сабе замену з ліку таленавітых выпускнікоў. Такога няма. Калі б мне цяпер сказалі «давайце вы пяройдзеце на паўстаўкі, а мы на вашае месца маладога возьмем», ды я з задавальненнем! Аднак гаворка была іншая: «Мне надакучыў «ценявы лідар, і я вас прыбіраю».

— Вам прапанавана супрацоўнічаць далей па сумяшчальніцтве. Чаму вы адмаўляецеся ад гэтага?

— Ведаеце, я лічу гэта проста знявагай. Адпрацаваць без нараканняў 32 гады — і перайсці на статус «пагадзінніка»... Я лічу, што заслужыла лепшага стаўлення. Сумяшчальнік — гэта часовы найміт. Сёння працуеш, заўтра не. Я ж не дзяўчынка 16 гадоў, каб лічыць за гонар, што мяне ўзялі ва ўніверсітэт па сумяшчальніцтве працаваць... Да таго ж, працаваць па сумяшчальніцтве — гэта значыцца мець нейкую асноўную працу. Аднак я хачу і магу працаваць тут як на асноўным месцы!

— Аднак пагадзіцца на сумяшчальніцтва — значыць, застацца са сваімі студэнтамі, давесці іх да выпуска. Чаму для вас так важны фармальны бок?

— Зараз я вяду 4 групы. Мой прадмет для іх спецыяльнасці профільны, галоўны — яны будуць здаваць па ім дзяржіспыт. Загадчыца кафедры прапанавала мне па сумяшчальніцтве весці толькі адну групу. Я лічу такое стаўленне непрымальным. Да таго ж, гэта зараз мне гаворыць, што ў верасні прымуць на сумяшчальніцтва. Улічваючы асабістыя стасункі, я ў гэта не веру.

Студэнты:

«Калі пачулі, што звальняюць Лаўрухіну — хацелі сысці з універсітэта ўсёй групай»

У студэнтаў кіпець эмоцый. Яны напісалі калектыўны зварот (49 подпісаў) дэкану, рэктару, міністру культуры (Універсітэт культуры падпарадкоўваецца гэтаму міністэрству). Многія з іх паступалі спецыяльна да Лаўрухінай. Цяпер яны ў роспачы ад рашэння кіраўніцтва ўніверсітэта не працягнуць Надзеі Міхайлаўне кантракт. Я сядзеў у аўдыторыі і проста слухаў іх, студэнтаў першага курса народнага аддзялення харэаграфіі. Градус напружання быў такі, што пытацца нічога не трэба было.

— Галоўны аргумент дэканата, што Лаўрухінай 63 гады, — кажа **Юлія КЛЫКАВА**. — Прыходзьце да нас на заняткі! Паглядзіце! Надзея Міхайлаўна настолькі вытанчаная і грацыёзная, што мы не перастаем здзіўляцца! Мы не адчуваем яе ўзрост!

— Я лічу, што лепшага педагога па народных танцах у краіне няма, — перакананая **Наталля ЖАРНАСЕК**. — Я не з неба вырашыла сюды паступаць, а ішла менавіта да гэтага выкладчыка. Бо ад сваіх педагогаў у каледжы чула водгукі пра Надзею Міхайлаўну як пра спецыяліста экстра-класа!

— Хочацца дадаць, — уступае ў размову **Марына КАРНІЛАВА**, — што ў нас ёсць педагогі, якія прыходзяць на занятак і тлумачаць усё на словах! Заняткі Надзеі Міхайлаўны заўсёды практычныя! Ніводзін элемент яна не патлумачыла, не прадэманстраваўшы яго! Яна ведае столькі танцавальных характараў, што нам і не снілася!

— Я прыехала з Магілёва, дзе вучылася ў харэаграфічным каледжы, — дадае **Юлія САВІЦКАЯ**. — Мае выкладчыкі ў каледжы раілі мне паступаць менавіта да Лаўрухінай! І вось цяпер яе звальняюць... Вучыцца тут далей не мае сэнсу, бо яна вядзе ў нас асноўны, профільны прадмет. Я лічу, што звальненнем Лаўрухінай мне могуць зламаць лёс.

— Мы ведаем, што на Надзею Міхайлаўну напісалі ананімку, што яна некаму там нагрубіла, — кажа **Крысціна МІКУЛІЧ**. — На занятках Надзея Міхайлаўна сапраўды можа і прыкрыкнуць, і сказануць жорстка. Сказаць: «Ты тлустая, трэба схуднець, каб добра танчыць» Крыўдна? Дык гэта праўда! І гэтая парада ад такога вопытнага выкладчыка можа наадварот заахвоціць чалавека, узняць яго! Аднойчы было, што Надзея Міхайлаўна накрычала на нас. Назаўтра яна прыйшла і выбачылася. Гэта — творчы працэс, тут усё ціха і спакойна быць не можа! Разумееце, мы, студэнты, кажам, што нас задавальняе такая манера выкладання — а выкладчыка забіраюць з-за нейкай ананімкі!

— Яна легендарны чалавек, яе ведаюць у Беларусі, Расіі, у іншых краінах, — усхвалявана кажа **Леанід ЗУЕЎСКІ**. — Я яшчэ са школы рыхтаваўся паступаць сюды, сачыў за гэтай сферай. Даруйце, але Надзея Лаўрухіна ў народным танцы — гэта як Юры Гагарын у касманаўтыцы. Бясспрэчны аўтарытэт, легенда!

— Мы звярталіся да дэкана, — кажа **Настасся КАПЫРКІНА**. — Яна нам усё расклала па палічках. Кажа, мы прапанавалі працаваць па сумяшчальніцтве, але Лаўрухіна адмовілася. І мы разумеем Надзею Міхайлаўну! Даруйце, але яна занадта заслужаны і прафесійны чалавек, каб пагаджацца на такую зняважлівую прапанову! Мы мяркуем, што нам да верасня знойдуць іншага выкладчыка, а Надзея Міхайлаўна застанецца за бортам...

— Фармальна кажучы, парушаюцца нашы правы, зрываецца навучальны працэс, нас пазбаўляюць выкладчыка галоўнай дысцыпліны! — падводзіць рысу **Маша ШАРКЕВІЧ**. — Мы не пагодзімся на іншага выкладчыка. Калі мы пачулі, што Лаўрухіну звальняюць, першая думка была — усёй групай напісаць заяву на адпачынак. Я скончыла харэаграфічны каледж у Віцебску, потым год чакала — і паступала спецыяльна на курс Лаўрухінай, бо так мне раілі мае выкладчыкі. Чаму я павінна цяпер вучыцца немаведама ў каго?

Пазіцыя ўніверсітэта

Святлана ГУТКОЎСКАЯ, загадчыца кафедры харэаграфіі (непасрэдная начальніца Н. Лаўрухінай):

Святлана Вячаслававўна так пракаментавала ліст, які Надзея Лаўрухіна напісала на імя міністра культуры (там яна выклала тое самае, што і ў гэтым інтэрв'ю).

— Асобе, ад імя якой быў напісаны ліст на імя міністра культуры, было афіцыйна прапанавана працягнуць кантракт да канца навучальнага года, каб нармальна дапрацаваць са студэнтамі. І з наступнага года перайсці працаваць на сумяшчэнне з гэтым жа курсам. Чалавек адмовіўся. Астатнія рэчы каментаваць не лічу патрэбным.

Наталля ШАЛУПЕНКА, дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва:

— Лаўрухіна Надзея Міхайлаўна, у якой заканчваецца кантракт, у адпаведнасці з нормамі заканадаўства была інфармавана аб спыненні працоўных адносін. Надзеі Міхайлаўне было прапанавана працягнуць кантракт да 30 чэрвеня, а ў далейшым працаваць па сумяшчальніцтве. Ад гэтых прапаноў Надзея Міхайлаўна адмовілася. Таму, на мой погляд, сітуацыі няма. Больш мне каментаваць няма чаго. Магу толькі дадаць, што Надзеі Міхайлаўне 64 гады, чалавек ва ўзросце. Яшчэ раз паўтару, што парушэння заканадаўства няма, а яе нежаданне працаваць на прапанаваных умовах — гэта яе рашэнне.

Погляд

На выкладчыцу былі скаргі?

То там, то тут супрацоўнікі ўніверсітэта ў неафіцыйных размовах згадвалі, што на Лаўрухіну былі скаргі. Як высветлілася, такое мела месца — мама студэнткі-завочніцы напісала скаргу, што Лаўрухіна груба размаўляла з яе дачкой на занятках, ледзьве не матам лаялася. Няхай такая скарга сапраўды ёсць. Але чаму кіраўніцтва ўніверсітэта зважае на адзін голас і не зважае на сорак дзевяць? Праверыць сутнасць скаргі складана. Аднак я адшукаў незаангажаванага чалавека — **выпускніцу Надзеі Лаўрухінай Марыю ТРЫПУЦЕНЬ**. Ёй няма сэнсу крывіць душой, ад выкладчыка і ўніверсітэта яна ніяк не залежыць.

— Надзея Міхайлаўна сапраўды бывала жорсткай на нашых занятках. На першым курсе мяне гэта нават бянтэжыла. Аднак потым я зразумела і ацаніла, што іначай мы не дасягнулі б поспеху! У студэнта ж не толькі вучоба ў галаве. І яна знаходзіла патрэбныя словы, каб давесці нам, чаму трэба надаваць увагу яе прадмету. Я паверу, што Надзея Міхайлаўна можа быць жорсткай і строгай на занятках. Што яна магла нахаміць і абмацярыць — гэтаму не паверу. Яна на такое не здольная — я вучылася ў яе 5 гадоў, таму магу меркаваць. Цяпер, скончыўшы ўніверсітэт, магу сказаць, што Надзея Міхайлаўна была адной з найлепшых выкладчыц і дала мне вельмі шмат.

Меркаванне выкладчыка

«У мяне шок, як абыходзяцца з маёй калегай»

Валянціна Віктараўна ЛЫСЯНКОВА, дацэнт кафедры харэаграфіі, якая працуе з моманту заснавання кафедры — з 1975 года!

— Для мяне шчыры шок тое, як абыходзяцца з Надзеяй Лаўрухінай. Ніхто на кафедры не чакаў такога... Без мінулага няма цяперашняга і няма будучага. Так абыходзіцца з адным са старэйшых выкладчыкаў — як мінімум не вельмі лагічна... Хачу сказаць адказна, што ў свае 63 гады Надзея Міхайлаўна знаходзіцца ў цудоўнай форме, цалкам адпавядае званню выкладчыка. Такіх, як яна, трэба шанаваць, а не «пераводзіць на сумяшчальніцтва». Надзея Міхайлаўна шчыра казала мне, што гэты набор будзе для яе апошнім — яна хацела заступіць месца маладым. Безумоўна, для спецыяліста ўзроўню Лаўрухінай прапанова пра сумяшчальніцтва — знявага, недарэчнасць.

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.

Юры БОНДАР, першы прарэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў:

«Гэта не звальненне, гэта перавод на іншую форму супрацоўніцтва»

— Юры Паўлавіч, юрыдычна ўніверсітэт мае права не працягнуць кантракт ці прапанаваць перайсці на іншую форму супрацоўніцтва выкладчыку пенсійнага ўзроста. Ці адна Надзея Лаўрухіна дасягнула пенсійнага веку сярод штатных выкладчыкаў Універсітэта культуры?

— Увогуле, ва ўніверсітэце існуе шмат формаў супрацоўніцтва з выкладчыкамі. Трагедыі ніякай няма. У нас 340 штатных выкладчыкаў, а агулам іх працуе больш за 460. Калі нават чалавек працуе па сумяшчальніцтве, ён усё адно застаецца дацэнтам, калі мае такую пасаду. Сітуацыя з пенсіянерамі падобная да іншых універсітэтаў — каля 14% выкладчыкаў дасягнулі 65 гадоў.

— Як юрыдычна выглядаюць стасункі з выкладчыкам, калі ён працуе па сумяшчальніцтве?

— Афармляецца працоўная дамова на перыяд навучальнага года — ад 1 верасня да 30 чэрвеня. Па сумяшчальніцтве ў нас працуе шмат вядомых людзей — тэатральныя дзеячы, супрацоўнікі бібліятэк, кіраўнікі розных узроўняў.

— Атрымліваецца, што цягам летніх вакацый сумяшчальнік нічога не атрымлівае?

— Так, дакладна.

— Ці ёсць ва ўніверсітэта прэтэнзіі да прафесійнага ўзроўню Надзеі Лаўрухінай?

— Да яе прафесійнага ўзроўню як харэографа — не. Яна даволі доўга працуе ва ўніверсітэце. Аднак, ацэньваючы дзейнасць выкладчыка, мы не павінны забывацца аб метадычных, навуковых, выхаваўчых складніках яго работы. Асаблівае значэнне маюць асабістыя стасункі настаўніка і яго выхаванца, студэнта — на жаль, у гэтых кірунках яны не заўсёды бываюць бездакорнымі.

— А чаму з ёй не працягнуты кантракт?

— Гэта права наймальніка, мы ўсё робім паводле закону. Увогуле, кожны ўніверсітэт сёння стаіць перад глабальнай праблемай амалоджвання кадраў. І каб прывабіць новыя кадры, трэба стварыць ім адпаведныя ўмовы — прапанаваць штатную пасаду. Маладога харэографа пагадзіннай аплатай не завабіш, бо па сваёй асноўнай прафесіі ў шоу-бізнэсе ён заробіць больш грошай... Адначасова мы мусім захаваць касцяк — паводле правілаў, не менш за 40% штатных выкладчыкаў мусяць мець навуковую ступень кандыдата, доктара навук, ці званне дацэнта альбо прафесара...

— Юры Паўлавіч, мне падалося, што для Надзеі Лаўрухінай пытанне стала не ў грошах, а ў прафесійным гонары, у статусе... Чаму немагчыма пакінуць яе ў штаце — скажам, перавесці на 0,5 стаўкі?

— Надзея Міхайлаўна мае аб'ём вучэбных даручэнняў, які адпавядае 0,75 стаўкі. Лагічна было прапанаваць ёй сумяшчальніцтва.

— Ёсць зварот студэнтаў — 49 навучэнцаў просяць пакінуць любімага выкладчыка. Чаму кіраўніцтва ўніверсітэта не прыслухаецца да меркавання такой колькасці сваіх гадаванцаў?

— Студэнты схільныя да максімалізму. Яны баяцца, што вось зараз у іх забяруць іх любімага выкладчыка. Гаворка пра гэта не ідзе. Яна як працавала ва ўніверсітэце, гэтак і будзе працаваць. Зменяцца ўмовы нашага супрацоўніцтва.

— Аднак на сённяшні момант яна афіцыйна звольненая з 29 сакавіка.

— Так. І з ёй будзе заключаная тэрміновая працоўная дамова да 30 чэрвеня 2011 года. А потым з 1 верасня мы з ёй заключым дамову як з сумяшчальнікам.

— Выкладчыца мяркуе, што яе звальненне — вынік непрыязнасці з боку загадчыцы кафедры...

— Я пра падобныя рэчы не чуў. Напэўна, абмяркоўваць такія аспекты ў прэсе будзе не зусім этычна.

— Наколькі Надзея Лаўрухіна для ўніверсітэта каштоўны супрацоўнік? Калі яна не пагодзіцца на ўмовы сумяшчальніцтва, якія лічыць прыніжальнымі, магчымыя яшчэ нейкія варыянты?

— Мы не бачым тут канфліктнай сітуацыі. Змена пакаленняў павінна адбывацца, гэта натуральны працэс. Аднак калі тут узнікла такая праблема, мы зноўку сустрэнемся з Надзеяй Лаўрухінай, са студэнтамі, з дэканам — і ўсё яшчэ раз абмяркуем, знойдзем прыймальную форму супрацоўніцтва з дадзеным педагогам.

Надзея Міхайлаўна падчас заняткаў.

БАРАЦЬБА ЗА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ САМАСВЯДОМАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ, або Навошта Сталін у 1944 годзе аформіў беларускую дзяржаўнасць?

МАТЭРЫЯЛЫ пра Беларускую армію, якая магла з'явіцца ў складзе Чырвонай Арміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, «Звязда» публікавала ў некалькіх нумарах у канцы снежня і пачатку студзеня. Гэтыя новыя звесткі пра ваенную гісторыю нашай дзяржавы выклікалі пэўны інтарэс у грамадстве — прыкладам таму можа стаць дакументальны фільм «Беларуская армія. Праект Панамарэнкі», які быў зняты і паказаны на тэлеканале АНТ пасля нашых публікацый. Сёння мы працягваем развіваць гэтую тэму з гісторыкам, даследчыкам нацыянальных працэсаў у Беларусі, выкладчыкам Інстытута інфармацыйных тэхналогій БДУІР Уладзімірам ГУЛЕНКАМ (*на фота*), які разам з галоўным архівістам Нацыянальнага архіва Беларусі Вячаславам СЕЛЯМЕНЕВЫМ і дырэктарам Дэпартамента па архівах і справаводстве Мінюста Уладзімірам АДАМУШКАМ спрабуе «дакапацца да ісціны» і ліквідаваць некаторыя прабелы ў беларускай гісторыі.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Уладзімір Іванавіч, у мінулы раз мы скончылі на тым, што выказалі здагадкі наконт таго, чым было выклікана прыняцце 24 сакавіка 1944 года Закона «Аб утварэнні саюзна-рэспубліканскага Народнага Камісарыята Абароны». Адно з меркаванняў, што такі крок быў зроблены для членства ў ААН. Гэта можна лічыць асноўнай версіяй?

— Скажам так: пра стварэнне Беларускай арміі ў часы ВАВ пісаў яшчэ 3 сакавіка 1993 года кандыдат гістарычных навук Міхаіл Шумейка ў газеце «Во славу Родины», у 2009 годзе ў Белостоку — польскі гісторык Яўген Міранowіч, ну а потым і мы з вамі. Версій шмат. Напрыклад, аўтары фільма «Беларуская армія. Праект Панамарэнкі», якія не пажадалі ўключыць нас у аўтарскі калектыў, не дачакаліся канчатковых вынікаў нашага даследавання і патлумачылі спробы стварэння Беларускай арміі ў складзе Чырвонай Арміі дзвюма прычынамі: кар'ерысцкімі імкненнямі Панамарэнкі і жаданнем Сталіна мець як мага больш галасоў у ААН.

Аднак у мяне ёсць сваё тлумачэнне тагачасных падзей. Аўтары фільма абвінавачваюць першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Панцеляймона Панамарэнку ў бязлітаснасці ў самым пачатку вайны. Я лічу, што гэта вельмі спрошчанае і прымітыўнае тлумачэнне тых падзей. На 12 гадзін 22 чэрвеня было запланавана адкрыццё Камсамольскага возера ў Мінску, але пачалася вайна. Першы раз Мінск бамбілі 24 чэрвеня, і адразу, нікога не папярэдзіўшы, усё кіраўніцтва краіны і ЦК Кампартыі з'ехала з Мінска. Дарэчы, гэтая інфармацыя была ва ўсіх сёды маглі звярнуцца да беларусаў і мінчан — маўляў, глядзіце, ён жа вас кінуў у 1941 годзе! І Панамарэнка не змог бы апраўдацца...Тым больш што некаторыя яго бліжэйшыя памочнікі пры эвакуацыі павадзілі сябе вельмі непрыстойна, чым пакінулі дрэннае ўражанне ў мінчан. Напрыклад, сакратар ЦК КП(б)Б Эйдзінаў для вывазу маёмасці сваёй кватэры адабраў транспарт, які вывозіў дзіцячы дом. Гэты выпадак быў на слыху ў гараджан вельмі доўга.

Наогул, я лічу, што камуністам Мінска сваё ж кіраўніцтва здрадзіла два разы. Першы раз — калі 23 чэрвеня пагражалі расстрэлам за паніку, а 24-га самі ўцяклі і кінулі 10 тысяч шэраговых камуністаў, нікога не папярэдзіўшы, не пакінуўшы арганізатараў падполля. Мінчане пачалі самі арганізоўвацца ў падполле, але яны не маглі паверыць, што іх кінулі — таму і кіраўнічы цэнтр назвалі дадатковым парткамам, бо лічылі, што Панамарэнка недзе пакінуў асноўны. І што атрымалася потым: у 1944 годзе, калі Чырвоная Армія вызваляла населеныя пункты, то парткамы выходзілі з падполля і атрымлівалі афіцыйную ўладу. Але не ў Мінску — сталічных падпольшчыкаў партыйныя вярхі не ведалі, таму мінскіх падпольшчыкаў палічылі... нямецкімі прыхвасцямі. Больш за 300 чалавек, каго мы сёння лічым героямі камуністычнага супраціву Мінска, былі рэпрэсаваныя НКУС. Астатнія падпольшчыкі сядзелі «цішэй вады, ніжэй травы» і баяліся нават сказаць пра свой удзел у падполлі. Толькі калі пачалі барацьбу за наданне Мінску звання Горад-Герой, падпольшчыкаў пачалі рэабілітаваць. Гэта было напярэдадні 20-годдзя Перамогі. Так што Панамарэнка адчуваў усё яшчэ сябе няёмка, што калісьці быў вымушаны з'ехаць з Мінска.

ГІСТАРЫЧНАЯ ПАДЗЕЯ

Даклад таварыша В. М. Молатава на X сесіі Вярхоўнага Савета СССР—падзея гістарычная. Пераўтварэнне Наркамата Абароны і Наркамата Замежных Спраў з агульнасаюзных у саюзна-рэспубліканскія Наркаматы сведчыць аб палітычнай спеласці нацыянальных савецкіх соцыялістычных рэспублік. З другога боку, гэта пераўтварэнне з'яўляецца выразам еднання ўсіх народаў СССР, іх згуртаванасці вакол магутнай партыі большавікоў, партыі Леніна—Сталіна.

Апрача таго, што гэтыя змены яшчэ больш павышаюць удзельную вагу кожнай саюзнай рэспублікі, пераўтварэнне яшчэ і яшчэ раз паказвае, наколькі памылковымі і тупаўмнымі былі разлікі фашысцкіх авантурыстаў, якія будавалі свае планы вайнавага разгрому СССР на петрыфікаванай брацкай сувязі савецкіх народаў.

Як грамадзянін Беларускай Савецкай Рэспублікі я поўны гордасці і радасці за свой геройчны народ, які да канца верны ідэям вялікага веку, ідэям Леніна і Сталіна.

Акадэмік Якуб КОЛАС, народны паэт БССР.

— А што наконт ААН?

— Сапраўды, ёсць тлумачэнні, што стварэнне Наркамата абароны было зроблена для таго, каб прапхнуць як мага болей рэспублік у заснавальніцы ААН. Гэты фактар важны, але, як мне здаецца, не галоўны. Усё было больш складана. Справа ў тым, што народы Беларусі і Украіны сталі тэрытарыяльна адзінымі ў сённяшнім разуменні пасля пачатку Другой сусветнай вайны. На 1 верасня 1939 года дзейнічаў пакт Молатава—Рыбентропа, і Сталін, пачакаўшы, пакуль польскае кіраўніцтва пакіне краіну, увёў войскі на тэрыторыю Заходняй Беларусі толькі 17 верасня. Дарэчы, я не лічу пакт Молатава—Рыбентропа амаральным з пункту гледжання той маралі, якая панавала ў міжнародных адносінах таго часу — так дзейнічалі ўсе. Адзінае, што сёння пра маральнасць можна разважаць толькі ў дачыненні дагавора аб сяброўстве і межах, які быў заключаны паміж СССР і нацысцкай Германіяй 28 верасня. Тут само слова «сяброўства» смярдзіць. Дамова была заключана пасля пачатку Другой сусветнай вайны з яе ініцыятарам. Але гэтая самая дамова аб сяброўстве першая юрыдычна афарміла ўз'яднанне тэрыторый Украіны і Беларусі. І калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, то пытаннем №1 у знешняй палітыцы стала пытанне аб прызнанні міжнароднай супольнасцю менавіта гэтых савецка-польскіх межаў, замацаваных у дамове аб сяброўстве з Гітлерам. Прычым не проста прызнанне — але і юрыдычнае афармленне, таму не было ніводнай афіцыйнай сустрэчы з амерыканцамі і англічанамі, дзе б савецкія дыпламаты не ставілі пытанне: прызнайце межы. І вакол гэтага ішоў страшэнны гандаль з 1941 па 1945 гады...

— Вось давайце тут спынімся больш падрабязна...

— Антысавецкім настроям у Еўропе ў цэлым і польскага грамадства ў прыватнасці (у тым ліку і ў Заходняй Беларусі) садзейнічалі і кіраўнікі СССР. Дастаткова ўзгадаць названую ўжо дамову аб сяброўстве, узнагароджанне Рыбентропа ордэнам Леніна або віншавальныя тэлеграмы і пасланні Гітлеру з нагоды акупацыі немцамі Польшчы, Нарвегіі, Даніі, Галандыі і іншых краін. А чаго варты даклад Молатава на кастрычніцкай (1939 г.) сесіі Вярхоўнага Савета СССР, якая была прысвечана ратыфікацыі савецка-германскага дагавора аб сяброўстве! У той час, калі палякі перажывалі самыя страшныя пакуты паражэнняў і акупацыі, кіраўнік савецкага МЗС з сарказмам публічна на ўвесь свет заявіў: «Кіруючыя колы Польшчы нямала фанабэрыліся «трываласцю» сваёй дзяржавы і «магутнасцю» сваёй арміі. Аднак аказалася дастаткова кароткага ўдару па Польшчы спачатку германскай арміяй, а затым — Чырвонай Арміяй, каб нічога не засталося ад гэтага выродлівага дзецішча Версальскага дагавора, якое жыло за кошт прыгнятання няпольскіх нацыянальнасцяў». Хіба гэтыя выказванні не абражалі гонар і годнасць польскага народа? Больш за тое, Молатаў здзекаваўся з саюзнікаў Польшчы, з Англіі і Францыі, якія заявілі, што мэтай аб'яўленай імі вайны з'яўляецца «знішчэнне гітлерызму». Цытую: «Ідэалогію гітлерызму, як і ўсялякую ідэалагічную сістэму, можна прызнаць або адмаўляць, гэта справа палітычных поглядаў. Але любы чалавек зразумее, што ідэалогію нельга знішчыць сілай, нельга пакончыць з ёй пры дапамозе вайны. **Таму не толькі бессэнсоўна, але і злачынна весці такую вайну, як вайну за знішчэнне гітлерызму»** *(вылучана аўт.)*. Гэтыя два палажэнні афіцыйнага даклада Молатава атруцілі не толькі савецка-польскія адносіны, але і беларуска-польскія. Бо менавіта ў верасні 1939 года адбылося аб'яднанне беларускіх земляў у адзінай дзяржаве. Хай у такім выглядзе, у складзе СССР, з яго перавагамі і недахопамі, але гэта было аб'яднанне аднаго народа. Беларусы гэтае яднанне падтрымалі. Палякі ж гэтую падтрымку разглядалі скрозь прызму слоў Молатава.

Масавыя дэпартацыі з Заходняй Беларусі пакінулі глыбокі след нават у свядомасці тых, каго яны не закранулі. Патэнцыйнымі ворагамі, магчымымі арганізатарамі антысавецкага супраціву лічыліся афіцэры, памешчыкі, бізнэсмены, паліцэйскія, дзяржслужачыя, настаўнікі, юрысты, палітычныя актывісты, у тым ліку і былыя члены КПЗБ. Дэпартаваліся не толькі мужчыны, але і іх сем'і. Шырокае распаўсюджанне набыла практыка закладніцтва родных палітычных апазіцыянераў. Дарэчы, у 1939-41 гадах дзейнасць беларускіх і украінскіх нацыяналістаў НКУС празяваў. Прынамсі, у штотыднёвых дакладах наркама НКУС БССР Цанавы на імя першага сакратара ЦК КП(б)Б Панамарэнкі пастаянна і скурпулёзна адсочваецца і аналізуецца дзейнасць украінскіх і беларускіх нацыяналістаў на тэрыторыі генерал-губернатарства (нямецкая зона акупаванай Польшчы), а на савецкай тэрыторыі — не. Наркам аналізуе дзейнасць і арганізуе ганенне ў БССР польскіх і сіняшніх палітычных структур. Справа ў тым, што беларускія і ўкраінскія нацыяналісты лічыліся прадстаўнікамі прыгнечаных народаў, якія змагаліся за сваю незалежнасць. З канца верасня 1939 года СССР і палітычныя структуры беларускіх і ўкраінскіх нацыяналістаў мелі агульнага «сябра» — Гітлера. Апамятаўся НКУС толькі ў другой палове мая 1941 года, калі ў Маскве была распрацавана спецаперацыя па знішчэнні нацыяналістаў Беларусі і Украіны: перад пачаткам ВАВ амаль 11,5 тысячы членаў сем'яў АУНаўцаў-падпольшчыкаў былі ўзяты ў закладнікі і вывезены ў Сібір. А калі дадаць сюды лёс расстраляных у Беларусі і Украіне зэкаў, якіх не паспелі эвакуяваць (а гэтыя ж зняволеныя ўсе былі тутэйшымі), то гэта прывяло да падзелу грамадства на тых, хто быў супраць савецкай улады, і хто быў за яе.

Давайце далей. 22 чэрвеня 1941 года Гітлер напаў на СССР, а ўжо 23 чэрвеня Сікорскі, прэм'ер-міністр урада Польшчы ў выгнанні, заявіў, што змена акупанта нічога для палякаў не мяняе, Польшча павінна вярнуцца да межаў, вызначаных Рыжскім мірным дагаворам у 1921 годзе, і што ў Польшчы два ворагі — СССР і Германія. Праз месяц Савецкі Саюз вымушаны быў прызнаць Польшчу сваім саюзнікам, бо польскі ўрад быў у Лондане і з'яўляўся саюзнікам Англіі, Францыі і ЗША. Ну а калі прызналі польскі ўрад, то значыць, прызналі і польскую дзяржаву. А тут аўтаматычна паўстае пытанне пра межы: палякі адназначна гаварылі, што савецка-польская мяжа павінна быць па стане на 1 верасня 1939 года, а Сталін — што па стане на 22 чэрвеня 1941 года. Гэта для Сталіна было справай гонару, тым больш што ў 1941 годзе Гітлер быў спынены пад Масквой.

— Якія довады былі ў Сталіна?

— Па-першае, гэта прэцэдэнт 1938 года, калі дзякуючы Мюнхенскай змове Польшча забрала сабе Цешынскую вобласць. І Сталін як быццам праецыраваў сітуацыю: калі вы ў сяброўстве з Гітлерам падзялілі Чэхаславакію, то чаму мы ў сяброўстве з Гітлерам не можам падзяліць вас? Мала хто ведае, што ў 1938 годзе ў Англіі Гітлер быў аб'яўлены чалавекам года як міратворац. Па-другое, у Заходнюю Беларусь Чырвоная Армія ішла не як заваёўнікі, а як вызваліцелі — савецкія страты падчас паходу ў Заходняя Беларусь і Украіну склалі па самых песімістычных падліках 1139 забітых і 2383 параненымі, а па афіцыйных звестках удвая менеў — 737 забітымі і 1862 параненымі. Для параўнання: гітлераўцы ў верасні 1939 года пры наступленні ў Польшчы згубілі 37 тысяч толькі забітымі.

Па-трэцяе, у 1939 годзе праведзены выбары ў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Прычым даволі дэмакратычныя — каля 25% змаглі выказаць сваю нязгоду праз галасаванне супраць, няяўку і г. д. Потым выбраныя дэпутаты прагаласавалі за аб'яднанне народаў Беларусі і Украіны, усё з юрыдычнага пункту гледжання было зроблена бездакорна. Гэта быў, па сутнасці, плебісцыт, ці, як кажуць, волевыяўленне народа.

Па-трэцяе, Савецкі Саюз не адмаўляў Польшчы ў праве на сваю дзяржаўнасць, але ў сваіх нацыянальных межах.

Сталін улічваў пазіцыі сваіх партнёраў па антыгітлераўскай кааліцыі з улікам міжнароднай маралі і міжнароднага права таго часу. Самай магутнай краінай свету была Вялікабрытанія, якая мела вялізныя калоніі і, вядома, пра правы народаў і не думала. А Савецкі Саюз выступаў за правы нацый на самавызначэнне. Амерыканцы больш схіляліся да савецкай ідэі, бо ім патрэбны былі рынкі збыту і каланіяльная сістэма гэтаму замінала.

— А што польскі ўрад?

— Польскі ўрад яшчэ з самага пачатку вайны ў 1939 годзе не рабіў прынцыповай розніцы паміж немцамі і саветамі — і тых, і тых лічылі акупантамі. Аднак цікава, што польскі бок ужо ў другой палове ліпеня 1941 года не настойвае на неадкладным вырашэнні пытання пра межы. Чаму? Уся справа ў грошах, бо польскі ўрад папрасіў пазыку ў Савецкага Саюза на стварэнне польскай арміі. З канца снежня 1941 па канец студзеня 1943 Польшча атрымала ад Сталіна 400 мільёнаў рублёў пазыкі для стварэння сваёй арміі і 15 мільёнаў рублёў незваротна для падтрымкі польскіх афіцэраў. Каля 400 тысяч грамадзян Польшчы былі амніставаныя ў СССР. На савецкай тэрыторыі створана армія Андэрса, якая ў лютым 1942 года налічвала больш за 75 тысяч чалавек. Дарэчы, пры яе фарміраванні таксама ўзнік канфлікт: польскі ўрад настойваў, што ў гэтую армію павінны быць прызваныя ўсе ваеннаабавязаныя жыхары Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі, але савецкі бок такую ідэю не падтрымаў. Сталін прапанаваў арміі Андэрса выехаць разам з Чырвонай Арміяй і такім чынам удзельнічаць у барацьбе з немцамі, прымаць непасрэдны ўдзел у вызваленні сваёй тэрыторыі. Але польскі ўрад адмовіўся, і, каб дагадзіць сваім англійскім саюзнікам, летам 1942 года армія Андэрса была перапраўлена ў Іран, а потым на афрыканскі тэатр ваенных дзеянняў. На дыпламатычным жа ўзроўні не было практычна ніводных больш-менш значных перамоў, дзе б не ўздымалася пытанне пра мяжу. Савецкі бок настойваў на прызнанні мяжы паміж Беларуссю і Польшчай, Украінай і Польшчай, а ўрад Польшчы адказваў, што такіх межаў не ведае, а ведае толькі мяжу паміж Польшчай і Расіяй. Такім чынам польскі эмігранцкі ўрад адмаўляў беларусам, украінцам, а таксама літоўцам у магчымасці прызнання іх дзяржаўнасці. На што разлічвалі палякі? Атрымаўшы ў Савецкага Саюза велізарныя грошы, сфарміраваўшы за гэтыя грошы армію, якая адмовілася ад непасрэднага ўдзелу ў баях за сваю тэрыторыю разам з Чырвонай Арміяй, а перайшла ваяваць за тысячы кіламетраў ад сваёй радзімы, няўжо палякі лічылі Сталіна такім прафанам, які б дазволіў польскаму ўраду пры такім падыходзе сфарміраваць на вызваленай польскай тэрыторыі варожы яму дзяржаўны апарат? Украінскі прафесар Уладзімір Макарчук апублікаваў цікавыя лічбы амерыканскіх вучоных: у Другую сусветную вайну кошт жыцця кожнага салдата амерыканцы ацанілі ў 30 тысяч доларaў у цэнах таго часу. А пры вызваленні Польшчы загінула 600 тысяч савецкіх салдат і афіцэраў! Вось і лічыце самі.

Мы ўжо пісалі, што з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны кіраўніцтва Польшчы распрацавала агульнапольскую аперацыю пад назвай «Вахляж». Яе сутнасць сфармулавана ў загадзе генерала Сікорскага № 499 ад 5 лютага 1942 года: «На абшарах на ўсход ад польскай мяжы распачаць дыверсійна-сабатажныя дзеянні як мага ў большым маштабе». Польскае кіраўніцтва добра ведала, што за любое забойства, раненне немцаў жыхары бліжэйшых населеных пунктаў падлягалі знішчэнню: за кожнага забітага немца — ад 10 да 100 чалавек з бліжэйшага населенага пункта. Такім чынам, падстаўляючы беларусаў і ўкраінцаў, акаўцы ім помсцілі за тое, што тыя ў 1939 годзе падтрымалі савецкую ўладу. Што ж тычыцца польскіх земляў, то там, наадварот, польскае кіраўніцтва хацела як мага болей абараніць і захаваць насельніцтва, таму кіраўнік «Вахляжа» палкоўнік Адам Грахольскі цвёрда загадаў: «За кожны стрэл на нашым баку мяжы будзе суд». Беларусы не ведалі гэтых загадаў, але рабілі правільныя высновы з рэальных дзеянняў польскай партызанкі на нашай тэрыторыі.

— Якую пазіцыю займалі іншыя саюзнікі?

— На савецкія прапановы Англія яшчэ вясной 1942 года выказалася, што Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна могуць увайсці ў Савецкі Саюз на правах аўтаномных рэспублік. Сікорскі ўвесь час агітаваў на свой бок Чэрчыля, але той казаў, што мы яшчэ не атрымалі перамогі, таму праблемы еўрапейскіх межаў будзем абмяркоўваць пазней. Маўляў, камунізм не вельмі пужае Вялікабрытанію, і нават калі некаторыя краіны выберуць такі рэжым, то Лондан не будзе супраць. Што тычыцца Рузвельта, то ён супраціўляўся не столькі таму, што хацеў Сталін, а метадам дасягнення гэтых мэтаў. Але ён разумеў, што Сталін не мае магчымасці прадэманстраваць уласнаму народу слабасць у пытанні межаў, здабытых беларусамі і ўкраінцамі ў 1939 годзе. Краіна-пераможца не магла губляць тэрыторыю. Такім чынам, Англія і ЗША не мелі жадання канфліктаваць з моцным саюзнікам, які прыняў на сябе асноўны ўдар. Так, яны адцягвалі вырашэнне пытання, але яны не хацелі сварыцца з-за польскіх інтарэсаў, тым больш што інтарэсы былі не зусім справядлівымі ў дачыненні беларусаў і ўкраінцаў.

Дарэчы, Сталін у дачыненні палякаў ніколі сантыментаў не адчуваў. У яго, напэўна, прысутнічаў фактар помсты, бо ён з Тухачэўскім у савецка-польскую вайну ў 20-х гадах атрымаў ад палякаў па зубах, вынікам чаго стаў ганебны Рыжскі мірны дагавор. Гэта быў правал і пляма на мундзіры Сталіна.

Сталін не быў бы Сталіным, калі б забыў польскім афіцэрам іх зверскія здзекі з яго, Сталіна, «братоў па зброі». Пра якую ж колькасць расстраляных і закатаваных польскімі вайскоўцамі савецкіх ваеннапалонных ідзе гаворка? Не ўступаючы ў абмеркаванне, чые лічбы больш дакладныя, проста прывядзём іх знешнія значэнні. Расійскія гісторыкі кажуць пра 60 тысяч чалавек, а польскія — пра максімум 16-18 тысяч. Але хай расійскіх ахвяр будзе нават меней, чым самыя малыя афіцыйныя польскія прызнанні. І ў такім выпадку 8 тысяч (па іншых звестках — 22 тысячы) расстраляных і закатаваных НКУС і пахаваных у Катыні польскіх афіцэраў цалкам растлумачваюць гэта як катынскую помсту Сталіна. Але тлумачыць — гэта не значыць апраўдваць! Мы прывялі звесткі, якія, па сутнасці, першым прывёў журналіст Мікалай Над (Дабруха) два месяцы таму ў «Комсомольской правде», ад сябе магу дадаць, што асноўную масу палонных чырвонармейцаў складалі мабілізаваныя беларускія і ўкраінскія сяляне. Ці не варта беларускаму грамадству паставіць пытанне перад Польшчай аб увекавечванні і іх памяці, а не толькі ахвяр Катыні?

Сталіну важна было даціснуць, маральна перамагчы палякаў, прымусіць іх прызнаць менавіта як здзейснены факт і межы, і дзяржаўнасць прыгнечаных стагоддзямі ўкраінцаў і беларусаў.

27 студзеня 1944 года адбыўся пленум ЦК ВКП(б). Яго матэрыялы засакрэчаныя і па сёння. Нават у зборніку «КПСС у рэзалюцыях і рашэннях» апублікавана толькі газетнае інфармацыйнае паведамленне з газеты «Правда»: «Днямі ў Маскве адбыўся чарговы Пленум Цэнтральнага Камітэта ВКП(б). Пленум ЦК разгледзеў прапановы Саўнаркама СССР аб пашырэнні правоў саюзных рэспублік у галіне абароны і знешніх зносін і ўхваліў іх для ўнясення на сесію Вярхоўнага Савета СССР, якая мае адбыцца». Такім чынам, у студзені 1944 года Сталін даў адмашку наконт стварэння паўнавартасных (хаця б знешне) 15 савецкіх дзяржаў. Пасля гэтага — сесія Вярхоўнага Савета СССР 1 лютага 1944 года, дзе прымаецца Закон аб стварэнні вайсковых фарміраванняў саюзных рэспублік і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага Камісарыята Абароны з агульнасаюзнага ў саюзна-рэспубліканскі Народны камісарыят. Цытата з даклада таварыша Молатава на гэтай X сесіі: «Сэнс пераўтварэння, якое прапануецца, поўнасцю зразумелы. Гэтае пераўтварэнне азначае большае пашырэнне дзейнасці савецкіх рэспублік, якое стала магчымым у выніку іх палітычнага, эканамічнага і культурнага росту, інакш кажучы — у выніку іх нацыянальнага развіцця...» і далей — **«Мы ведаем, што ваенным разгромам фашысцкіх сіл нельга абмежавацца. Трэба, каб маральна-палітычны разгром фашызму таксама быў даведзены да канца...»** *(вылучана аўт.)*. Бачыце, у чым сутнасць — «маральна-палітычны». Трэба было маральна дабіць, а не толькі з дапамогай зброі. Такім чынам Наркаматы Абароны і Замежных спраў ствараюцца не для ААН (хаця, безумоўна, гэты фактар таксама ёсць), а для перамогі ў барацьбе за нацыянальную самасвядомасць беларусаў і ўкраінцаў. Маўляў, мужыкі, глядзіце — мы вам афармляем дзяржаўнасць, і вы ў такой вайне не дарма змагаліся.

Дарэчы, з нагоды гэтай X сесіі Вярхоўнага Савета СССР у друку выказаліся выдатныя беларускія дзеячы. Напрыклад, за подпісам Якуба Коласа надрукаваны наступны тэкст: «Даклад таварыша В.М. Молатава на X сесіі Вярхоўнага Савета СССР — падзея гістарычная. Пераўтварэнне Наркамата Абароны і Наркамата Замежных Спраў з агульнасаюзных у саюзна-рэспубліканскія Наркаматы сведчыць аб палітычнай спеласці нацыянальных савецкіх сацыялістычных рэспублік...». А вось што пісаў Рыгор Шырма: «З вялікім задавальненнем мы сустрэлі паведамленне аб Законах, прынятых X Сесіяй Вярхоўнага Савета СССР. Наша родная Беларусь, разам з іншымі саюзнымі рэспублікамі, атрымлівае вялікія правы і паўнамоцтвы. Гэта значыць, наша рэспубліка ўзмужнела, вырасла ў сваім нацыянальным развіцці... Пашырэнне правоў саюзных рэспублік мае велізарнае міжнароднае значэнне. Гэта новы маральна-палітычны ўдар па фашызме, які не прызнае свабоднага нацыянальнага развіцця народаў».

Потым, як мы ўжо пісалі ў ранейшых публікацыях, 24 сакавіка 1944 года Вярхоўным Саветам БССР былі прынятыя Законы «Аб утварэнні саюзна-рэспубліканскага Народнага Камісарыята Замежных Спраў БССР» і «Аб утварэнні саюзна-рэспубліканскага Народнага Камісарыята Абароны». Я перакананы, што 24 сакавіка — не выпадковая дата. Гэта зрабілі свядома, на злосць нацыяналістам: маўляў, глядзіце, мы робім тое, пра што вы толькі марылі і фантазіравалі (25 сакавіка 1918 года Трэцяй устаўной граматай была абвешчана незалежнасць БНР. — Аўт.).

Гутарыў Павел БЕРАСНЕЎ.

(Працяг будзе.)

УНП 100092167.

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ОАО «ЦЕНТРОЭНЕРГОМОНТАЖ» ЗА 2010 ГОД

Адрес: 220033, г. Минск, переулок Велосипедный, 7, тел. 298 48 02

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2011 г.

5. Количество акционеров – всего **364,** в том числе юридических лиц – **2,** физических лиц – **362.**

6. Информация о дивидендах и акциях:

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	**0**	**161**
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	**0**	**511**
Обеспеченность акции имуществом Общества	тысяч рублей	**93**	**81**
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	штук	**31823**	**19169**

7. Информация о задолженности (только в составе годового отчета):

Наименование показателя	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Просроченная дебиторская задолженность	миллионов рублей	**0**	**0**
Просроченная кредиторская задолженность	миллионов рублей	**0**	**0**

9. Среднесписочная численность работающих (человек) – **1073**

10. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **строительство инженерных сооружений.**

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2011 г.

АКТИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства:			
первоначальная стоимость	101	29 310	32 857
амортизация	102	13 599	16 193
остаточная стоимость	110	15 711	16 664
Нематериальные активы:			
первоначальная стоимость	111	10	7
амортизация	112	8	6
остаточная стоимость	120	2	1
Доходные вложения в материальные ценности:			
первоначальная стоимость	121	-	-
амортизация	122	-	-
остаточная стоимость	130	-	-
Вложения во внеоборотные активы	140	645	915
В том числе: незавершенное строительство	141	645	915
Прочие внеоборотные активы	150	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**16 358**	**17 580**
II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы и затраты	210	18 652	15 511
В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы	211	11 810	9 713
животные на выращивании и откорме	212	-	-
затраты в незавершенном производстве и полуфабрикаты	213	889	1 647
расходы на реализацию	214	-	-
готовая продукция и товары для реализации	215	5 326	3 643
товары отгруженные	216	-	-
выполненные этапы по незавершенным работам	217	-	-
расходы будущих периодов	218	627	508
прочие запасы и затраты	219	-	
Налоги по приобретенным товарам, работам, услугам	220	**28**	**50**
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются более чем через 12 месяцев после отчетной даты)	230	-	
В том числе: покупателей и заказчиков	231	-	-
прочая дебиторская задолженность	232	-	-
Дебиторская задолженность (платежи по которой ожидаются в течение 12 месяцев после отчетной даты)	240	19 049	18 646
В том числе: покупателей и заказчиков	241	15 183	11 890
поставщиков и подрядчиков	242	1 106	3 295
по налогам и сборам	243		-
по расчетам с персоналом	244	2 316	2 456
разных дебиторов	245	442	993
прочая дебиторская задолженность	249	2	12
Расчеты с учредителями	250	-	
В том числе: по вкладам в уставный фонд	251	-	
В том числе: прочие	252	-	
Денежные средства	260	1 281	2 244
В том числе: денежные средства на депозитных счетах	261	-	-
Финансовые вложения	270	164	164
Прочие оборотные активы	280		
ИТОГО по разделу II	**290**	**39 174**	**36 615**
БАЛАНС (190 + 290)	**300**	**55 532**	**54 195**

ПАССИВ	Код строки	На начало года	На конец отчетного периода
1	2	3	4
III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ			
Уставный фонд	**410**	380	6 282
Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей)	411	- 250	- 796
Резервный фонд	420	-	
В том числе: резервные фонды, образованные в соответствии с законодательством	421	-	-
резервные фонды, образованные в соответствии с учредительными документами	422	-	-
Добавочный фонд	**430**	20 656	16 837
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	440	-	
Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток)	**450**	1 185	286
Целевое финансирование	460	-	-
Доходы будущих периодов	470		
ИТОГО по разделу III	**490**	**21 971**	**22 609**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	27	19
Прочие долгосрочные обязательства	520	1 717	1 103
ИТОГО по разделу IV	**590**	**1 744**	**1 122**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	5 790	8 450
Кредиторская задолженность	620	26 012	21 997
В том числе: перед поставщиками и подрядчиками	621	7 732	4 286
перед покупателями и заказчиками	622	11 708	10 028
по расчетам с персоналом по оплате труда	623	2 163	2 151
по прочим расчетам с персоналом	624	363	346
по налогам и сборам	625	1 431	1 131
по социальному страхованию и обеспечению	626	703	691
по лизинговым платежам	627		
перед прочими кредиторами	628	1 912	3 364
Задолженность перед участниками (учредителями)	630	15	17
В том числе: по выплате доходов, дивидендов	631	-	-
прочая задолженность	632	15	17
Резервы предстоящих расходов	640		-
Прочие краткосрочные обязательства	650	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**31 817**	**30 464**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**55 532**	**54 195**
Из строки 620:			
долгосрочная кредиторская задолженность	701		
краткосрочная кредиторская задолженность	702	26 012	21 997

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ С 01 ЯНВАРЯ 2010 г. ПО 31 ДЕКАБРЯ 2010 г.

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
1	2	3	4
I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ			
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	129 737	105 271
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	14 791	13 388
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) (010-011)	020	114 946	91 883
Справочно: из строки 010 сумма государственной поддержки (субсидий) на покрытие разницы в ценах и тарифах	021	-	-
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	106 247	81 341
Валовая прибыль (020-021-030)	040	8 699	10 542
Управленческие расходы	050	-	-
Расходы на реализацию	060	-	-
**ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от реализации товаров, продукции, работ

СКАНВОРД

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



АДКАЗЫ НА СКАНВОРД

Па гарызанталі: «Стаўрыянт». Піва. Ілі. Цэйс. Аўст. Корд. Карп. Азот. Арангутан. Акварэль. Аўт. Нуліні. Эстрада. Ікс. Ток. Цемра. Маштаб. Бат. Атава. «Разам». Кармя. Інот. Пуціна. Эмір. Раса. Рыні. Назагрт. **Па вертыкалі:** «Уязкоджанне». «Цырк». Баўл. Мэбі. «Іскра». Зтон. Сатран. «Арлі». «Афіцэры». Шапыёка. Ілман. Этан. Аланіс. Навой. Бэз. Тарэн. Скнад. Мак. Этна. Гэава. Шыр. «Дзяўчаты». Орт. Донка. Хата. Чака. Пальт.

Крымінал

ІНВАЛІД НА ІНВАЛІДА

Вечарам у Ляснянскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў (Баранавіцкі раён) узнік скандал.

Два інваліды 1-й групы ў сваім пакоі выпілі па чарцы, а затым пачалі біцца. Пад руку 60-гадоваму мужчыну трапіўся нож, і ён нанёс удар удвая маладзейшаму. Апошняга з цяжкім раненнем грудзей даставілі ў бальніцу.

РАСПРАНУЛА

50-гадовая жыхарка Кобрына запрасіла да сябе знаёмую, яны выпілі.

А затым 22-гадовая госця сілай забрала ў гаспадыні кофты, курткі, боты... і пайшла. Заведзена крымінальная справа.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СКРАЛІ ЦЕПЛАВУЮ ГАРМАТУ

Жыхар гарадскога пасёлка Відзы паведаміў у Браслаўскі раённы аддзел унутраных спраў пра тое, што нехта скраў цеплавую гармату і 50 метраў электрычнага кабелю, якія ён пакінуў у гаражы ля свайго дома.

Агульны кошт скрадзенага — больш за мільён рублёў. Высветлілася, што з незамкнутага гаража гармату і кабель скраў зямляк — раней судзімы за крадзеж 21-гадовы хлопец. Заведзена крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДОБРА «ПАДРЫХТАВАЛІСЯ»...

У паляўнічых угоддзях Іванаўскай раённай структуры таварыства паляўнічых і рыбаловаў яго супрацоўнікі разам з работнікамі Пінскай міжрайінспекцыі спынілі для праверкі мікраўтобус «Мерседэс-Бэнц 208Д».

Пры праверцы салона былі знойдзены: матацыкл «ІЖ», тры незарэгістраваныя, зараджаныя патронамі з кулямі, паляўнічыя стрэльбы (з замацаванымі да ствалоў лямпамі-фарамі), тры акумулятары да іх, два паляўнічыя патранташы і 23 патроны з дробам, карцеччу, кулямі. Былі затрыманы двое грамадзян, якія не працуюць. Яшчэ два парушальнікі збеглі. Разглядаецца пытанне аб распачынанні крымінальнай справы за незаконнае паляванне з выкарыстаннем наземнага механічнага транспартнага сродку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА II КВАРТАЛ і I ПАЎГОДДЗЕ 2011 г.
Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*I квартал*	*паўгоддзе*
63850 (індывідуальны)	**12400**	**37200**	**74400**
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	**11600**	**34800**	**69600**
63858 (ведамасны)	**19900**	**59700**	**119400**
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	**18000**	**54000**	**108000**

Заставайцеся з намі!

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПАДУМАЙ І РАШЫ

Г. Новікаў (Мінск)



Белыя: Крa8; пп. a6, c2, e2, e6 (5)

Чорныя: Крf8, Сa4; пп. b5, f4 (4)

Выйгрыш.

В. Тупік (Брэсцкая вобл.)



Белыя: Крg4, Лh8, Сa8, Cd8 (4)

Чорныя: Крc1, Сa1; пп. b2, b3, c2, c3 (6)

Нічыя.

Чакаем вашых адказаў.

ТЭХНІКА КАМПАЗІЦЫІ

Удзельнікі нашых конкурсаў пры рашэнні шахматных задач і эцюдаў знаходзяць пабочныя рашэнні, дуалі і нават абвяржэнні аўтарскіх задум. Яны прысылаюць свае выпраўленні дэфектаў. Гэта сведчыць пра тое, што нашы чытачы акрамя рашэнняў цікавяцца і складаннем шахматных кампазіцый.

Прапануем прыняць удзел у аднаўленні пазіцыі двухходовай задачы па яе рашэнні з мэтай адпрацоўкі тэхнічных прыёмаў па будоўлі кампазіцыі.

А каб аднавіць пазіцыю любой задачы па яе рашэнні, трэба спачатку выявіць становішча часткі фігур. Потым устанаўліваецца характар абарон і аслабленняў, аднімаючых палі вакол чорнага кароля. Заканчваецца праца знаходжаннем уступнага ходу і стараннай праверкай. Усё гэта дасягаецца тэхнічным патэнцыялам складальніка.

А цяпер прапануем вучэбнае заданне аднавіць пазіцыю двухходовай задачы, якая мае такое рашэнне:

1. Фf7? пагрозы 2. Ф:b7, С:b7x, 1... Ла7 2. Kb6x, але 1... Се7! 1. Фb3?~2. Ф(С):b7x, 1... Ла7 2. Kb6x, 1... Cb4! 1. Фg2?~2. C:b7x, 1... Ла7 2. Kb6x, 1... C:f3 2. Ф:f3x, 1... Cd6!

Рашае 1. Фd5! пагроза 2. Ф:b7x, 1... Ла7 2. Kb6x, 1... C:d5 2. C:d5x. Аўтарская пазіцыя мае 10 фігур.

Тэрмін працы — да 1 чэрвеня г.г.

Пераможцы будуць адзначаны дыпломамі.

Адноўленыя задачы, адлюстраваныя на дыяграмах, прысылайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда».

ЮБІЛЕЙНЫ КОНКУРС

Часопіс «Phenix» (Францыя) аб'явіў конкурс складання шматхадовак і задач на кааператыўны мат за 2 хады.

Конкурс прысвечаны юбілею французскіх праблемістаў Р. Лекомта і Ж. Морыса. Задачы пасылаць да 30 чэрвеня г.г. на адрас: Abdelaziz Onkoud, 8 sguare Moliere, 3425, 93240 Stains, France (Францыя).

Дунайкоўскія хвалі

Сцвярджаюць, што сярод безлічы турыстычных маршрутаў найбольш арыгінальным з'яўляецца воднае падарожжа па Дунаі — рацэ, што працякае па тэрыторыі ці па мяжы адразу дзесяці краін Еўропы. І ўсё ж гэты варыянт — не лепшы. Дунай знаходзіцца далёка. Затое блізка — Дунаёк.

«Дунайскі» ці балтыйскі след?

Пра Латышову гару і ручай

Каб трапіць у гэтую вёску, можна выбраць трасу з Быхава на Рагачоў. Але прасцей — запытацца ў Быхаве пра больш прамую дарогу ў паўднёва-заходнім напрамку. Па ёй да пункта прызначэння давядзецца праехаць каля двух з паловай дзясяткаў кіламетраў, прычым недзе на палове шляху закончыцца асфальт і пачнецца грунтоўка. Аднак своеасаблівай «кампенсацыяй» за пэўную нязручнасць будуць навакольныя краявіды — амаль суцэльны, вельмі густы лес.

Зрэшты, казаць пра гэтыя мясціны выключна як пра «глухія» не выпадае. Дакладна вядома, што яшчэ стагоддзе таму тут нават была ўласная «вытворчасць» — вінакурня, гарэлачны склад, а таксама вадзяны млын. Менш пэўнасці з іншым — назвай Дунаёк.

— Наша вёска ўтварылася на правым беразе ракі Грэза пры ўпадзенні ў яе невялікага ручая, прычым ён ніколі, нават у лютыя маразы не замярзаў — магчыма, таму людзі правялі «паралелі» са знакамітай еўрапейскай ракой і назвалі ручай Дунайком, — кажа супрацоўнік мясцовай бібліятэкі Валянціна Аляксандраўна Хмяльніцкая. — Але ёсць і другая версія. Справа ў тым, што некалі тут жылі перасяленцы з Латвіі. А назва вёскі ўтварылася ў выніку сугучча з латышскімі словамі «глеістая зямля». І зямля ў нас, асабліва каля рэчкі, на самай справе такая — глеістая, амаль белая, вязкая.

Рэна Цярэнцьеўна Майстранкова з дачкой Ларысай Міхайлаўнай і ўнучкай Аляксандрай: тры пакаленні — адна справа.

Напамінак аб латышах застаўся дагэтуль — адно з узвышшаў каля вёскі завецца Латышовай гарой. А да канца 1960-х былі ў Дунайку і асобныя латышскія могілкі. Цяпер прадстаўнікоў балтыйскага народа тут ужо няма, перад самай вайной яны масава з'ехалі на гістарычную радзіму. І ў тым ліку з-за вядомых падзей. У сувязі з утваронным мясцовага калгаса латышоў прымусілі змяніць звыклы лад жыцця і перасяліцца з навакольных хутароў у вёску. Праўда, зламаць звычкі да канца ўсё роўна не атрымалася. На новым месцы многія хаты будаваліся паасобку, крыху наводдаль адна ад другой. А адсюль і даволі цікавае назіранне: калі намаляваць цяперашні план Дунайка, то атрымаюцца... амаль дакладныя абрысы бусла.

Але гэтая адметнасць — не адзіная. У Дунайку захавалася традыцыя ладзіць Каляды, многія з вяскоўцаў і сёння плятуць з лазы кошыкі. А хтосьці — вышывае. Прычым у бабулі Рэны Цярэнцьеўны Майстранковай, яе дачкі Ларысы Міхайлаўны Косцінай і ўнучкі Аляксандры вышыванне стала, па сутнасці, сямейным заняткам.

— Вышываць крыжыкам я пачала яшчэ пасля вайны, а час той быў цяжкі — калі-нікалі неставала нават нітак, — узгадвае Рэна Цярэнцьеўна. — І ўсё ж па-сапраўднаму заняцца гэтай справай атрымалася толькі на пенсіі, калі з'явілася больш вольнага часу. Прычым вышываннем захапілася і дачка. А за ёй — унучка.

Штосьці з сюжэтаў яны бяруць з часопісаў, а штосьці — прыдумваюць самі. Але галоўнае ў іншым. Тры майстрыхі могуць паказаць дзясяткі прыгожа аздобленых сурвэтак, вышываныя карціны, абразы. Пры гэтым уражвае: на адну такую работу можа спатрэбіцца цэлы месяц.

— Я прыехала ў Дунаёк па размеркаванні пасля заканчэння Магілёўскага педінстытута ў 1990 годзе і, калі шчыра, першым часам тут было крыху нязвычна, — распавядае Ларыса Міхайлаўна. — Але асвоілася даволі хутка. Прырода наўкол цудоўная, вёска была вялікая, і да таго ж у ёй жыло вельмі шмат моладзі — словам, сумаваць не выпадала. Вось так і зніклі ўсе сумненні. А цяпер Дунаёк для мяне — і ўвогуле самы родны.

Грошы дае... лес

Адзін з найбольш папулярных у свеце вальсаў мае даволі красамоўную назву — «Дунайскія хвалі». І аб гэтым узгадваеш мімаволі. Дунаёк бачыў лепшыя часы, аднак цяпер грэбня яго «хвалі» пайшла ўніз.

Не надта ўрадлівая глеба тут была заўсёды, і ўсё ж вельмі доўга мясцовы калгас трымаўся «на плыву». А потым адбылося што адбылося. У 1990-х, калі падтрымка сельгаспрадпрыемстваў зменшылася, здарылася некалькі неўраджайных гадоў запар. У калгаса з'явіліся даўгі, якія, як той снежны камяк, пачалі нарастаць. У вёсцы спынілася будаўніцтва жылля, зменшыліся заробкі, пачаліся праблемы з іх выплатай. Урэшце рэшт сельгаспрадпрыемства атрымала статус банкрута і з канца 2007 года спыніла сваё існаванне. Частку былых «калгасных» земляў перадалі лясніцтвам, а частку — і ўвогуле перавялі ў «запас».

З таго часу свабоднымі землямі цікавіліся два фермеры, адзін з іх меў намер вырошчваць рапс, а другі — гадаваць жывёлу. Вось толькі па невядомых прычынах у абодвух выпадках справа так і не пачалася. Так, хтосьці з былых работнікаў сельгаспрадпрыемства знайшоў сабе месца ў навакольных лясніцтвах. Але далёка не ўсе. Цяпер з чатыры дзясяткі працаздольных дунайкоўцаў не маюць «афіцыйнага» занятку.

— Людзі не апусцілі рукі, некаторыя робяць стаўку на асабістую гаспадарку, трымаюць кароў і здаюць малако, садзяць бульбу, засяваюць вялікія, па 30-50 сотак, участкі кабачкамі — потым кабачкі прадаюцца на Быхаўскі агароднінасушыльны завод, — зазначае старшыня Дунайкоўскага сельсавета Кацярына Свірыдзенка. — Іншыя ж жывуць з лесу: улетку збіраюць і здаюць нарыхтоўшчыкам ці ў лясніцтвы чарніцы і лісічкі, увосень — журавіны, узімку — шышкі. Нашы грыбы-ягады не забруджаныя радыяцыяй, іх вельмі шмат, таму хто не лянуецца — можа някепска зарабіць. І ўсё ж без сваёй вытворчасці — цяжка.

Ад ракаў да святой вады

Якіх-небудзь «вытворчых праектаў» тут сёння няма. Ды і спадзявацца на тое, што раптам «хтосьці прыйдзе і захоча ўкласці вялікія грошы», асабліва таксама не выпадае. Бо і да горада, і да чыгункі — няблізка. Плюс да ўсяго атрымліваецца не надта прывабнай статыстыка — амаль кожны другі жыхар вёскі і навакольля ўжо знаходзіцца на пенсіі.

Аднак ставіць крыж на будучым Дунайка рана. Вёска налічвае 270 жыхароў, мае ўласныя сярэднюю школу, дзіцячы садок, пошту, комплексна-прыёмны пункт, клуб, бібліятэку, ФАП, дзве крамы. А яшчэ тут проста прыгожае і надзвычай ціхае месца.

— У нас амаль што запаведнік, у лесе шмат зайцоў, дзікоў, ліс, тут можна сустрэць лася, а казулі часта пасвяцца літаральна ля дарогі, — усміхаецца Кацярына Свірыдзенка. — У рэчцы Грэзе жывуць бабры, добра ловяцца шчупакі, плоткі і акуні. А таксама — ракі. Вада сапраўды чыстая, дно прасвечваецца на некалькі метраў.

Валянціна Хмяльніцкая збірае летапіс вёскі больш за дзесяць гадоў.

Апроч таго, тут жа — і некалькі ўнікальных помнікаў прыроды. Недалёка ад Дунайка больш за два гектары займаюць сосны-гіганты вышынёй пад 20 метраў. Крыху ў іншым баку ёсць магчымасць пазнаёміцца з 300-гадовым волатам-дубам. Аднак ці не найбольш адметны пункт навакольля — каскад з трох крыніц. Сёння каля іх стаіць адноўленая каплічка. Прычым па ваду з крыніц едуць не толькі з усёй Беларусі, але і з Расіі, краін Балтыі. Гэта вада не псуецца па некалькі месяцаў і, як лічыцца, мае цудадзейную сілу — дапамагае аднавіць зрок і палепшыць работу сэрца.

Пры гэтым ці не самае дзіўнае — пустыя дамы ў Дунайку амаль не карыстаюцца попытам, купіць сабе хату тут можна ці не за мільён рублёў.

— Магчыма, у нечым нам не пашанцавала, менш чым за дзесяць кіламетраў адсюль знаходзіцца буйное Чыгірынскае вадасховішча, і ўсе «дачнікі» з Быхаўскага раёна і Магілёва — менавіта там, — адзначае Кацярына Свірыдзенка. — Аднак хочацца спадзявацца, што гэта часова, што нехта зверне на вёску ўвагу і паспрабуе стварыць прынамсі адну аграсядзібу. Бо Дунаёк нічым не горшы. А дранікі, бабку, клёцкі, журавінны морс і «фірмовую» настойку з каліны для турыстаў тут прыгатуе ці не кожны.

Сяргей ГРЫБ. Фота аўтара.

Быхаўскі раён.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.06	18.27	12.21
Віцебск —	5.55	18.18	12.23
Магілёў —	5.56	18.18	12.22
Гомель —	5.53	18.14	12.21
Гродна —	6.21	18.43	12.22
Брэст —	6.22	18.43	12.21

Месяц

Апошняя квадра 26 сакавіка. Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Васілісы, Галіны, Настассі, Віктара, Дзяніса, Кандрата, Купрыяна, Леаніда, Серафіма.*

К. *Пелагеі, Конрада, Фелікса.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

23 сакавіка

1906 год — 105 гадоў назад нарадзіўся Ісак Любан, вядомы беларускі кампазітар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Аўтар славутай беларускай песні «Бывайце здаровы», пісаў таксама музыку да беларускіх фільмаў «Новы дом», «Палеская легенда», радыёпастановак, спектакляў драматычных тэатраў. У 1946 годзе за музыку да спектакля «Несцерка» быў удастоены Дзяржаўнай прэміі СССР.

1910 год — нарадзіўся Акіра Курасава, славуты японскі кінарэжысёр. Уклад Курасавы ў сусветны кінематограф сапраўды бясцэнны, яго творчасць паслужыла свайго роду мостам паміж традыцыйным кіно і мадэрнам. У 1990 годзе ён быў узнагароджаны спецыяльным «Оскарам» за дасягненні, якія натхнілі і аказалі вялікае ўздзеянне на кінематографаў усяго свету, Курасава ўзнагароджаны таксама юбілейнай прэміяй МКФ у Венецыі і іншымі нацыянальнымі і міжнароднымі прызамі.

Цытата дня:

«Не саромейся вучыцца ў сталым узросце: лепш навучыцца позна, чым ніколі».

Эзоп (VI ст. да н.э.), старажытнагрэчаскі байкапісец.

ПАДУШКА

Невядома, ці ведалі нашыя продкі пра егіпецкія піраміды, але практычна ў кожнай хаце была свая «егіпецкая піраміда», а часам і не адна — піраміда з падушак. Кожную раніцу гаспадыня засцілала ложак і складвала падушкі па памеры: ад самай вялікай да самай малой. Колькасць падушак магла быць рознай: ад трох да дванаццаці і больш. Прычым самая маленькая падушка іншы раз дасягала якраз памера вуха (пад-вушка).

● У дачыненні да падушкі — звычайнай хатняй рэчы — у славян былі распрацаваны так званыя залатыя правілы. Але самым галоўным было наступнае: на падушцы катэгарычна забаранялася сядзець (!), інакш «адсядзіш» свой розум (згубіш шчасце, паразуменне з іншымі людзьмі, страціш сваю долю і інш). Але як толькі падушка трапляла ў поле дзеяння сямейных абрадаў, да яе ставіліся, прытрымліваючыся іншых патрабаванняў.

● З-пад галавы паміраючага чалавека выцягвалі звычайную падушку і падкладалі спецыяльна падрыхтаваную, у якую напіхвалі салому (часцей гарохавую). Лічылася, што курынае пер'е «не дае памерці». Маглі пакласці ў яе лісце ці дубчыкі з веніка, а таксама валасы і пазногці, якія збіраліся на працягу ўсяго жыцця паміраючага чалавека.

● Таксама спецыяльную падушку клалі ў труну. Часцей за ўсё яе напаўнялі драўлянай стружкай.

● Пасля таго, як падзялілі каравай, нявесту маглі пасадзіць на пуховую падушку. Потым на гэтую ж падушку садзіліся тыя дзяўчаты, якія па розных прычынах доўгі час не маглі выйсці замуж.

● Пры дапамозе падушкі варажылі. Каб убачыць у сне свайго суджанага, дзяўчаты клалі пад падушку розныя рэчы (напрыклад, грэбень).

● Калі чалавек не мог доўга заснуць, раілі перавярнуць падушку. Калі губляў сон, то перад тым, як легчы спаць, чытаў замовы, напрыклад такія: «Раніцняя зара Марыянна, вячэрняя зара Марыя, паўдзённая, паўночная і начная Наталля, здыміце з мяне, рабы Божай (імя), бяссонніцу, аднясіце яе на кусты, на сухія лясы. Амін».

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнемся

ПРАВІЛЫ ДЛЯ ПАЛЯЎНІЧЫХ... НА МУХ

Амерыканскія навукоўцы высветлілі, што трэба зрабіць, каб забіць муху. І апублікавалі 5 парад, як карыстацца мухабойкай.

Прафесар Майкл Дзікінсан займаецца вывучэннем аэрадынамікі палётаў мух 20 гадоў і нарэшце змог сфармуляваць правілы для паляўнічых на мух. Падчас доследаў насякомых змяшчалі ў адмысловую камеру, а затым па нітцы пад вуглом у 50 градусаў рухалі да іх плексігласавы дыск, які ўвасабляў мухабойку. І здымалі дзеянні мухі на камеру з частатой 5400 кадраў у секунду. У выніку навукоўцам удалося вывесці наступныя пяць правіл:

1. Не трэба спрабаваць забіваць муху ў палёце, яны здольныя змяніць курс усяго за 30 тысячных доляў секунды.

2. Падыходзьце да мухі павольна, павольныя рухі яна не заўважае.

3. Падыходзіце да мухі ззаду, поле зроку ў насякомага не дасягае 360 градусаў.

4. Падбірайце мухабойку пад колер сцен, яна будзе менш прыкметная на іх фоне.

5. Адгадвайце, куды паляціць муха, і біце не прама ў яе, а крыху наперад па накірунку яе руху.

Спадзяёмся, што яшчэ праз 20 гадоў прафесар Дзікінсан пацешыць чытачоў новымі ўзрушвальнымі адкрыццямі.

Яўгена ПЯСЕЦКАГА

ФОТА СЛОВА

Я насмажу скварачак
Шчодра, па-сялянску,
А паверху дранічак
З бульбы мараканскай.
Пакладу капустачкі
(вырасла ў Аўстраліі),
Ды каўбаскі лустачку —
«Зроблена ў Італіі»...
Паўсусвету мне вядома
Ежаю чужынскай:
Я купляю ў гастраномах,
Бо жыву у Мінску...
Снег за вокнамі, але
Ў думках я далёка —
На сняданак у мяне
Дранікі з Марока!

(У гэтыя дні мінскія магазіны гандлююць замежнай ранняй бульбай. Хто браў — кажа: тая ж самая, як наша, толькі кошт іншы...)

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, С.ГРЫБ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: rek@zvyazda.minsk.by*

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 33.380. Індэкс 63850. Зак. № 1358. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12